Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ЗВЯЗДА

8 чэрвеня 1991 г. СУБОТА

№ 111 (21639)

Цана 10 кап.

Газета выдаецца са жніўня 1917 года

Орган Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі, Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў Беларускай ССР

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ АД 18 ДА 18 СУТАК

І НАВАТ НА РУБЛІ

У Гомелі адкрылася другая Міжнародная выстаўка-продаж інфармацыйнай тэхнікі і абсталявання, у якой прымаюць удзел больш дваццаці савецкіх прадпрыемстваў і замежных фірм з ЗША, Канады, Індыі, Аўстрыі, Польшчы, Германіі і Балгарыі.

На выстаўцы прадстаўлены камп'ютэры, капіравальнае абсталяванне, відэаапаратура, спадарожнікавыя антэны — усяго больш як 200 відаў вырабаў.

— Усё пералічанае, — расказвае дырэктар Беларускага агенцтва навукова - тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, кандыдат эканамічных навук Сяргей Бадруноў, — на працягу чатырох дзён будзе прадавацца як на валюту, так і на рублі. У праграме заключэнне здзелак і кантрактаў, семінар па пытаннях менеджменту, маркетынгу і рэкламы, работа Гомельскай таварна - сыравіннай біржы. Як і летась, у час першай выстаўкі, мы чакаем заключэння здзелак на дзесяткі мільёнаў рублёў.

ІТАЛІЯ СТАНЕ БЛІЖЭЙ

ПІНСК. (С. Шапіра). У гэтыя дні значна ўзрасла цікавасць да Італіі ў выхаванцаў Пінскай школы-інтэрната. Справа ў тым, што яны атрымалі афіцыяльнае запрашэнне на месячны адпачынак на адзін з міжземнаморскіх курортаў.

Усе выдаткі, звязаныя з паездкай, узяла на сябе каталіцкая царква Ватыкана. У Італію адправяцца 30 дзяцей-сірот. Летась дзве групы выхаванцаў школы-інтэрната правялі канікулы ў Францыі і Польшчы.

ЮБІЛЕЙ ІНСТЫТУТА

Учора адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае 70-годдзю Інстытута гісторыка-палітычных даследаванняў Кампартыі Беларусі. Іменна такую назву носіць зараз былы Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Гэта навуковая ўстанова за гады сваёй дзейнасці ўнесла значны ўклад у даследаванне гісторыі мясцовых партыйных арганізацый, пытанняў партыйнага будаўніцтва, перакладанне твораў класікаў марксізму-ленінізму на беларускую мову. У актыве інстытута — кнігі па гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі, дакументальныя зборнікі з гісторыі Кампартыі рэспублікі, мемуарныя працы па гісторыі ўсенароднай барацьбы ў Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Цяпер асноўны напрамак дзейнасці інстытута — работа Кампартыі Беларусі, яе месца і функцыі ў сучасным абноўленым грамадстве, арыентаваным на дэмакратычны, гуманны сацыялізм, а таксама аналіз актуальных праблем сучаснага грамадскага развіцця, ідэйных і палітычных пазіцый палітычных партый і рухаў. Інстытут рыхтуе і выпускае навукова-інфармацыйны бюлетэнь «Партыйны веснік». Высокі навуковы патэнцыял Інстытута гісторыка-палітычных даследаванняў Кампартыі Беларусі, як адзначалася на пасяджэнні, дазваляе яму іці ў нагу з жыццём, уносіць свой уклад у напісанне гісторыі нашай рэспублікі.

ПІЦЦЕ ПІВА ПЕННАЕ...

СВЕТЛАГОРСК. Куды больш прыемна выпіць куфаль смачнага піва ў цёплым, утульным памяшканні, пасядзець за чыстым сталом з сябрамі, чым глытаць тое ж «пеннае» дзесьці ў завуголлі з асабістай шклянкі. У гэтым сэнсе светлагорцам пашанцавала, — у горадзе адкрыўся піўны рэстаран «Чабарок».

Апрача свежага піва, шампанскага і сухога віна, спецыялізаваны рэстаран прапануе сваім гасцям багаты асартымент гарачых і халодных закусак і нават чырвоную ікру. Комплекс каштуе ад 3 да 8 рублёў. Калі ўзяць у разлік высокую культуру абслугоўвання і сучасны ўзровень цэн, можна сказаць, што «Чабарок» — недарагое месца для адпачынку. Рэстаран не адчувае недахопу ў наведвальніках.

● СТОП-ФАКТ ● СТОП-ФАКТ ● СТОП-ФАКТ

ШУКАЮЦЬ ДУРНЯЎ

МІНСК. Людзі па прыродзе сваёй даверлівыя. І, каб падмануць чалавека, не трэба якіх-небудзь асаблівых прыстасаванняў. Прасцей за ўсё згуляць на спрадвечным імкненні чалавека да лёгкага багацця і... добра нажыцца самому на гэтай справе. Менавіта такімі метадамі карыстаюцца заснавальнікі «гульняў», хваля якіх літаральна захліснула Беларусь.

Першы крок зрабіў Рыжскі камерцыйны банк, нарадзіўшы паштовую забаву пад назвай «Супер банк сістэм». Усяго за 900 рублёў нам абяцалі неверагодны выйгрыш у 76 тысяч «драўляных». Лічбы, як кажуць, уражваюць, і таму жадаючых знайшлося даволі многа. Але энтузіязм хутка згасаў, бо людзі, чакаючы «цуда», пачыналі разумець, што дарэмна патрацілі грошы. А некаторым не ўдалося нават збыць з рук карткі гэтай гульні. І ўсё ж знайшліся «шчасліўцы», перш за ўсё з кола заснавальнікаў гульні, а таксама іх родных і знаёмых. Яны і «адмылі» грошы даверлівых ігракоў. Дарэчы, Рыжскі камерцыйны банк абяцае пэўную частку сродкаў ад гульні пералічыць у фонд Чарнобыля. Пажывём — пабачым.

«А чым мы горшыя за рыжан», — падумалі прадпрымальнікі з Мінска, Масквы, іншых гарадоў краіны і павялі масавую атаку на кашалькі народа. «Гульні» пачалі расці, як грыбы пасля дажджу. З'явіліся карткі Таварыства інвалідаў і адной з акцыянерных кампаній таго ж Рыжскага банка. І вось літаральна з учарашняга дня ў Мінску пачалі гасцяваць дзве чарговыя «пустышкі». Мінскае гарадское таварыства «Веды» і маскоўскае аб'яднанне «Бярозка» вырашылі біць прама ў цэль. Зараз усяго за 30 рублёў вы маеце шанц стаць уладальнікам немалой сумы грошай. Разлічаны новыя гульні перш за ўсё на студэнтаў, пенсіянераў і іншыя малазабяспечаныя катэгорыі насельніцтва. Згадзіцеся, што 30 рублёў — гэта не дзевяцьсот. Усё гэта так. Але...

Па-першае, для атрымання выйгрышу неабходна, каб ваша картка абышла ні больш ні менш як 1.024 чалавекі. Па-другое, усё гэта вельмі нагадвае тыя лісты з абяцаннем мільёна, якія разпораз з'яўляюцца ў нашых паштовых скрынках.

Па-трэцяе. Памятайце, што залішняя даверлівасць небяспечная для вашага здароўя і фінансавага становішча. Такія «гульні» проста так не пачынаюць. Так і хочацца паўтарыць: «Людзі, будзьце пільнымі!»

18 СТРЭЛАЎ ПА... ВАРТАЎНІКУ

ГОМЕЛЬСКІ РАЁН. (У. Рыгораў). Вартаўнікі ў нашым уяўленні асобы, якія павінны пільна стаяць на варце дзяржаўнай і кааператыўнай маёмасці. І неяк не верыцца, што хто-ніхто з іх можа быць злодзеем, як кажуць, без адрыву ад вытворчасці. Але вось факт.

Вартаўнік саўгаса «Усход» С. узваліў на выгнаную з гаража грузавую аўтамашыну ГАЗ-53 металічны каркас для уласнай цяпліцы і ў тры гадзіны ночы ўзяў курс да сваёй хаты. Ды, аказваецца, не спала ў гэты позні час міліцыя. Работнікі яе вырашылі праверыць у начнога вадзіцеля дакументы. Але той на шалёнай скорасці прамчаў міма. Пачалася пагоня, у час якой міліцыянеры зрабілі ажно 18 папераджальных стрэлаў. Грузавік спыніўся толькі тады, калі былі расстраляны колы. С. махнуў у лес, дзе і быў злоўлены.

ДЗЕ ТВАЕ 17 ГОД?

МІНСК. Аўтобус 104-га маршруту на скрыжаванні праспекта Любімава і вуліцы Бялецкага сутыкнуўся з матацыклам «Ява-350», якім кіраваў 17-гадовы хлопец, вучань 11-га класа 67-й школы. У выніку сутыкнення юнак загінуў, а пасажыр, які ехаў разам з ім, з пераломам чэрапа змешчаны ў бальніцу.

Надзвычайная ўвага да надзвычайных сітуацый

Ці патрэбен рэспубліцы свой закон аб надзвычайным становішчы? Калі так, то якім ён павінен быць і калі яго прымаць? Абмеркаванне гэтага пытання заняло істотную частку рабочага часу дэпутатаў, а заадно яшчэ раз акрэсліла палітычныя схільнасці нашых парламентарыяў.

Перш чым трыбуну сесіі прадаставілі міністру юстыцыі рэспублікі Л. Дашуку, прагучалі такія перасцярогі:

Г. Какарэка: Мне ўяўляецца сімвалічным разгляд праекта Закона аб надзвычайным становішчы адразу пасля праблем Камісіі па рэабілітацыі. На маю думку, пасля прыняцця такога закона Камісія па рэабілітацыі не страціць сваёй актуальнасці і ў наступным стагоддзі.

Р. Вячэрскі: Закон аб надзвычайным рэжыме практычна адкрывае дарогу дыктатуры ў рэспубліцы. Але ў Беларусі сёння няма ніякіх падстаў для развіцця дыктатарства. Беларускі народ працуе стабільна, трэба яму даць магчымасць і далей так працаваць.

Як паказала далейшае абмеркаванне гэтай даволі сур'ёзнай для кожнага з нас праблемы, прамоўцы размежаваліся па разуменню самога прадмета размовы: што лічыць надзвычайнай сітуацыяй? Пажар, выбуху, тэхналагічную катастрофу, эпідэмію ці нейкія сацыяльныя ўзрушэнні ў грамадстве? Тыя, хто выступаў за прыняцце закона, рабілі націск на першую частку нашага пераліку, апаненты заклікалі глядзець, на іх думку, у корань, — такі закон патрэбен, каб расправіцца з забастоўшчыкамі, стачкомамі, усімі іншадумцамі. У праекце разам з іншымі жорсткімі мерамі прадугледжана ва ўмовах надзвычайнага становішча забараняць, у прыватнасці, правядзенне сходаў, мітынгаў і дэманстрацый, эвальценне рабочых і служачых па іх уласнаму жаданню, правядзенне любых забастовак, назначаць і знімаць з пасад кіраўнікоў прадпрыемстваў.

Прапануецца некаторыя справы разглядаць аднаасобна народным суддзёй або начальнікам органа ўнутраных спраў ці яго намеснікам, або камендантам асобнай мясцовасці. Агаворана нават магчымасць формы кіравання, пры якой улада пераходзіць да камітэтаў асобага кіравання або спецыяльна ўпаўнаважаных асоб.

Як падкрэсліў у дакладзе Л. Дашук, неабходнасць распрацоўкі памянёнага праекта закона ўзнікла не пасля забастовак. У студзені гэтага года адбылося пасяджэнне Вярхоўнага Савета рэспублікі, дзе была зацверджана распрацоўка праекта. Урад выканаў волю Прэзідыума.

Чым жа, на думку міністра, выклікана патрэба ў законе? Існуе аналагічны саюзны закон, ён рэгулюе пытанні ўвядзення надзвычайнага становішча саюзнымі органамі. Суверэнная Беларусь павінна мець сваю лінію ў такіх сітуацыях. Па-другое, надзвычайнае становішча можа ўзніклуць не толькі па палітычных матывах. Аварыі, катастрофы таксама стварацюць вострыя сітуацыі. На думку Л. Дашука, аб'яўленне надзвычайнага становішча ў час чарнобыльскай катастрофы магло б адыграць пэўную ролю. Законаў, на жаль, не было.

Садакладчык міністра, М. Грыб, звярнуў увагу дэпутатаў на тое, што прыняцце закона зусім не азначае неабходнасці яго ўвядзення. Як жа абыходзіцца без прававых норм у экстрэмальных сітуацыях?

Як рэагавалі на такія развагі дэпутаты?

В. Ціхіня: Падобныя законы ёсць у многіх краінах цывілізаванага свету. Так, заканадаўствам ЗША прадугледжана магчымасць увядзення рэжыму надзвычайнага становішча, напрыклад, у выпадку масавых

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ЗВАРОТ
Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі
ДА ЛЕНІНГРАДЦАЎ

Камуністы Савецкай Беларусі з глыбокай занепакоенасцю ўспрынялі паведамленне аб намечаным Ленсаветам на 12 чэрвеня г. г. рэферэндуме аб перайменаванні горада Ленінграда ў Санкт-Пецярбург. Трывогай і болем адазвалася гэта вестка ў сэрцах мільёнаў жыхароў нашай рэспублікі — ветэранаў вайны і працы, рабочых і калгаснікаў, інтэлігенцыі і моладзі.

Ленінград дарагі не толькі ленінградцам. Слаўны горад на Няве стаў сімвалам айчыннай гісторыі, гордасцю савецкага народа. Імя вялікага Леніна ўвайшло ў яго лёс па волі пакалення, якое здзейсніла першую ў свеце сацыялістычную рэвалюцыю, адстаяла заваёвы Кастрычніка ў перыяд грамадзянскай вайны. Увесь свет ведае аб бяспрыкладнай мужнасці і стойкасці ленінградцаў у барацьбе з фашызмам — 900-дзённай гераічнай абароне горада. У гэтай жорсткай сутычцы з ворагам абаронцам Ленінграда дапамагалі ўсе народы нашай многанацыянальнай краіны.

З ленінградцамі, з вашым выдатным горадам-героем, горадам-працаўніком жыхароў Беларусі звязваюць даўнія і трывалыя духоўныя вузы. У гады Вялікай Айчыннай вайны на беларускай зямлі, на фронце і ў партызанскіх атрадах, адважна змагаліся тысячы ўраджэнцаў Ленінграда і Ленінградскай вобласці, многія з якіх аддалі сваё жыццё за свабоду нашага краю. Ля манумента Перамогі ў Мінску, ля сцен крэпасці-героя Брэста захоўваюцца капсулы і са свяшчэннай, абільна палітай крывёю ленінградскай зямлёй. Беларускі народ будзе вечна ўдзячны жыхарам горада Леніна за іх бескарыслівую, сапраўды брацкую дапамогу ў цяжкі пасляваенны час, калі з берагоў Нявы ў Беларусь паступалі крайне неабходныя для яе адраджэння станкі і абсталяванне, калі па закліку сэрца да нас прыехалі сотні высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія плячо ў плячо з беларусамі самааддана працавалі, каб падняць нашу рэспубліку з руін і попелу. Цесныя партнёрскія сувязі падтрымліваюць многія працоўныя калектывы гарадоў і вёсак Беларусі з калектывамі ленінградскіх прадпрыемстваў і сёння. Жыццё не раз пераконвала нас у плённасці такога супрацоўніцтва. Працоўныя Беларусі са свайго боку будуць і ў далейшым рабіць максімум магчымага, каб гэтыя дзелавыя кантакты развівалися і ўмацоўваліся, што асабліва важна ва ўмовах эканамічнага крызісу, які ахапіў краіну.

Вось чаму ўсё, чым жывуць ленінградцы, выклікае павышаную цікавасць у жыхароў нашай рэспублікі. Вось чаму так усхвалявала камуністаў і беспартыйных нечаканае паведамленне аб магчымым змяненні назвы вашага горада. Гэтага дапусціць нельга. Перайменаванне Ленінграда выкліча далейшы раскол у грамадстве, сур'ёзна ўскладніць працэс дэмакратычных пераўтварэнняў.

Дзень 12 чэрвеня 1991 года не зможа зацьміць другую памятную і дарагую для ўсіх нас дату — 26 студзеня 1924 года, калі Другі з'езд Саветаў СССР задаволіў просьбу Петраградскага Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, падтрыманую ўсім савецкім народам, і ўвекавечыў імя Леніна ў назве горада, што стаў калыскай рэвалюцыі, сусветна-гістарычнае значэнне якой прызнана ўсім прагрэсіўным чалавецтвам. Чаму ж сёння лёс гэтага рашэння пераглядаецца толькі ленінградцамі?

Патрыятызм, вернасць ленінградцаў інтэрнацыянальнаму абавязку высока цэняцца ўсімі народамі Айчыны. Да вашага голасу, да вашай думкі прыслухоўваюцца ва ўсіх кутках краіны. Ці маеце права вы, нашы браты і сёстры, пагрэбаваць патрыятычнымі пачуццямі ўсіх расіян, жыхароў іншых рэспублік?

Мы разглядаем назначаны Ленсаветам рэферэндум як палітычную акцыю, накіраваную на тое, каб выкрасліць з памяці народа імя заснавальніка Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы Уладзіміра Ільіча Леніна, і лічым, што рыхтуемы акт знявагі гістарычнага лёсу многіх пакаленняў савецкіх людзей павінен быць неадкладна спынены ціяпрашнімі кіраўнікамі краіны, і ў першую чаргу Прэзідэнтам СССР М. С. Гарбачовым.

Ленінградцы!

Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі, падзяляючы глыбокую трывогу жыхароў рэспублікі за вынікі маючага адбыцца рэферэндуму, звяртаецца да вас з заклікам сказаць сваё рашучае «не!» перайменаванню Ленінграда.

Мы верым, што рабочы клас і інтэлігенцыя, ветэраны і моладзь горада на Няве ў гэты гістарычны час праявяць высокую адказнасць і абароняць Ленінград.

Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі.

Не здраджваць Леніну!

Ветэранская грамадскасць Беларусі з глыбокім болем і абурэннем успрыняла паведамленне аб мяркуемым правядзенні 12 чэрвеня г. г. палітычнай акцыі-рэферэндуму аб перайменаванні горада Ленінграда ў Санкт-Пецярбург.

Ленінград — гэта нацыянальны гонар народа, яго жывая гісторыя. У суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны пры падтрымцы ўсяго савецкага народа ленінградцы адстаялі горад ад ворага, здзівіўшы свет сваёй мужнасцю і гераізмам.

Гісторыі вядома, што была зроблена спроба змяніць назву горада на Санкт-Пецярбург Гітлерам. Нават на картах фашыстаў горад быў абазначаны як Санкт-Пецярбург. Аднак на Піскароўскіх могілках ляжаць ленінградцы, а не пецярбуржцы. У памяці народнай свята захоўваецца подзвіг горада-героя Ленінграда. Дык што, мы павінны сёння здраджваць гэтай памяці, здраджваць Леніну?

Мы, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, франтавікі і працаўнікі ваеннага тылу, блакаднікі, якія прымалі непасрэдны ўдзел у абароне Ленінграда, а сёння жывуць за межамі горада, разам з двухмільённым калектывам ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл Беларусі заяўляем Ленсавету рашучы пратэст па правядзенню процізаконнай палітычнай акцыі.

Па даручэнню ветэранскай грамадскасці Беларусі

А. АНДРЭЕЎ,
старшыня Беларускага рэспубліканскага савета ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл, народны дэпутат СССР.

Выбарачная ўборка шматгадовых траў пачата ў калгасе «XXI партз'езд» Ушацкага раёна. Праўда, не радуюць першыя ўкосы. З-за частых халодных дажджоў злакавыя аказаліся горшымі, чым чакалася, хоць усе работы па догляду за пасевамі праводзіліся своечасова. Таму ўжо цяпер у гаспадарцы востра пастаўлена пытанне: як нарыхтаваць не менш 22 цэнтнераў кармавых адзінак на ўмоўную галаву, каб забяспечыць сытую зімоўку і захаваць пагалоўе жывёлы?

Фота А. ЦЕРЛЮКЕВІЧА. (БЕЛТА).

ЛОЗУНГІ НЕ НАКОРМЯЦЬ

На апошніх сесіях Вярхоўнага Савета рэспублікі шмат увагі ўдзялялася праблемам развіцця сельскай гаспадаркі. Лішне казаць, якое важнае значэнне мае гэтае пытанне. Праблем тут, відаць, больш, чым у якой-небудзь іншай галіне народнагаспадарчага комплексу. «Звязда» не раз пісала аб іх. Зусім нядаўна мы паведамлялі, напрыклад, пра зварот савета кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў Смалявіцкага раёна да Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР з пакетам патрабаванняў аб змяненні механізма існуючых узаемаадносін паміж прамысловымі і сельскагаспадарчымі галінамі вытворчасці, аб павышэнні закупачных цэн на прадукцыю вёскі з улікам падаражання прамысловай, змяншэння падаткаабкладання і многімі іншымі.

Адным словам, праблем у вяскоўцаў сёння больш чым дастаткова. Як яны будуць вырашацца, якія з іх першачарговыя — адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні прагучалі ў час сустрэчы журналістаў са старшынёй пастаяннай Камісіі Вярхоўнага Савета БССР па аграрных пытаннях, прадуктах харчавання і сацыяльнаму развіццю сяла Уладзімірам Гаркуном, народным дэпутатам рэспублікі, старшынёй калгаса-камбіната «Барацьба» Пухавіцкага раёна Іосіфам Макарэвічам і Міхаілам Русым—старшынёй Камітэта па зямельнай рэформе і землеўладкаванню пры Савеце Міністраў БССР.

Калі гаварыць аб законапраектах па гэтаму пытанню, прынятых Вярхоўным Саветам рэспублікі, то ўмоўна іх можна падзяліць на дзве групы: зямельная рэформа і эканамічнае становішча калгасаў і саўгасаў.

Зямельная рэформа пачалася ў рэспубліцы 2 месяцы назад. За гэты час зроблена многае: узнікла звыш 350 сялянскіх гаспадарак, у іх карыстанне перададзена 6.780 гектараў зямлі, пад расшырэнне асабістых гаспадарак—яшчэ 117.452 гектары. Гэта раўназначна плошчы буйнога раёна, дык ці трэба казаць, што рэформа ідзе павольна. Праблем з зямлёй у нас няма. Галоўнае тут — матэрыяльная аснашчанасць.

Калі ж гаварыць аб эканамічным стане калгасаў, саўгасаў, прадпрыемстваў перапрацоўчай прамысловасці, — зазначыў У. Г. Гаркун, — то яго можна назваць крытычным: разрыў гаспадарчых сувязей па пастаўках матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў, некіруемы і некантралюемы рост цэн на прамысловую прадукцыю, каштарысныя нормы і расцэнкі ў будаўніцтве, неадрэгуляванасць ўзаемаадносін АПК з бюджэтам. Усё гэта ў значнай ступені прывяло да зніжэння ў I квартале 1991 года закупак малака на 11 працэнтаў (132 тыс. т), мяса на 2 працэнты (8,3 тыс. т), дойны статак скараціўся больш чым на 50 тысяч галоў. На 243 мільёны рублёў менш атрымана прамысловай прадукцыі ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года. Такая абстаноўка можа прывесці ў хуткім часе да разарэння звыш 60 працэнтаў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

Вось чаму так неабходна было прыняцце гэтых законапраектаў — Кодэкса аб зямлі, пастановы па зямельнай рэформе, Закона «Аб прыярытэтным сацыяльна-эканамічным развіцці вёскі і агрэпрамысловага комплексу». Праект апошняга быў уключаны ў парадак гэтай сесіі толькі пад націскам аграрыяў, якія ў адваротным выпадку пагражалі пакінуць горад без малака і мяса. Праўда, калі справа дайшла да яго абмеркавання, то раўнадушных у зале не было.

Яшчэ адно пытанне: быць ці не быць калгасам і саўгасам? Уладзімір Гільяравіч сказаў, што сёння ён стаіць на цвёрдай пазіцыі: у гэтай форме ці іншай, аднак калектыўныя сельскія гаспадаркі павінны існаваць. За паўтара — два гады знішчыць іх можна. Аднак, не стварыўшы нічога ўзамен, мы прывядзём краіну да голаду, магчыма, больш страшнага чым у 1933 годзе.

М. І. Русы дабавіў:

— Цяперашняя форма вядзення сельскай гаспадаркі стабільная. За апошнія месяцы ўсё больш шырокі размах набывае паявая форма. Кожны калгаснік будзе мець пай, працаваць, і з гэтага паю ў канцы года атрымліваць прыбытак. Гэта значыць, што яго даход у такім выпадку прама залежыць ад якасці працы. Вось дзе выхоўваецца пачуццё гаспадара.

Спецыялісты падлічылі, што выкананне прынятых законаў будзе каштаваць чатыры з паловай мільярды рублёў. Ці ёсць упэўненасць, што гэтыя грошы дадуць сельскай гаспадарцы ўсё, чаго чакаюць там?

— Не ўпэўнены, — гаворыць У. Гаркун. — Буду гарантавана ўпэўнены толькі тады, калі будзе эквівалент цэн на сельскагаспадарчую і прамысловую прадукцыю. Калі ж яго не будзе, то ні чатыры, ні пяць, ні дваццаць мільярдаў праблемы не вырашаць. Таму мы і напісалі ў сваіх патрабаваннях ураду: узнімаеце на 15 працэнтаў кошт прамысловай прадукцыі — узнімайце на столькі ж і на нашу. Мы нічога больш не хочам. Я думаю, гэта справядлівае патрабаванне. Акрамя таго, павінны быць зменены закупачныя цэны, аднак змяненне закупачных цэн не павінна сёння закранаць рознічныя. «Дзірка» тут можа закрыцца або за кошт бюджэту, або з іншых крыніц.

Прыватнае ўладанне зямлёй. Сёння гэтае пытанне набывае хутчэй палітычную афарбоўку. А як адносяцца да яго самі аграрнікі?

І. А. Макарэвіч, шматгадовы практык:

— Справа ў тым, што, як ні дзіўна, але гэтае пытанне часцей задаюць гараджане. На апошнім агульным сходзе калгаснікаў нашай гаспадаркі мы якраз гаварылі аб гэтым. Я сам некалькі разоў ставіў пытанне канкрэтна: хто жадае атрымаць у прыватную ўласнасць зямлю. Ні адзін калгаснік зямлі браць не хоча, ды і не можа. Гэта не толькі ў нашым калгасе. Так усюды. Возьме, напрыклад, вясковец надзел у 5—10 гектараў. Як угнаіць гэтую зямлю? Трэба трымаць многа жывёлы, бо зямля наша бедная. А тэхніка? Дзе ўзяць яе? Конь з плугам тут невялікая дапамога. Ды і якая розніца—спадчыннае валоданне зямлёй ці прыватнае. Любы сяльчанін, які мае каля хаты 30 сотак, лічыць гэтую зямлю сваёй. Паспрабуй урэж хоць з паўсоткі...

Адвечнае пытанне: колькі каштуе зямля? У нас, як вядома, можа весціся гаворка толькі аб падатку за карыстанне ёю. Гектарны надзел будзе каштаваць у Беларусі ад 5 да 160 рублёў у год. Гэта што датычыць фермераў. Прамысловыя ж прадпрыемствы заплацяць значна больш: у Мінскім раёне, напрыклад, да 600—700 тысяч. Зямля ў такім выпадку на многія гады выходзіць з абароту, прыходзіцца ўлічваць гэта.

Тут трэба дадаць, што раз у пяць гадоў праводзіцца кадастравая ацэнка зямлі. Калі камісія высветліць, што яна выкарыстоўваецца неэфектыўна, зарастае пустазеллем, пустуе, то надзел будзе забіраца. Інакш нельга.

У. Г. Гаркун паведаміў яшчэ аб адным цікавым факце: 1 мільён гектараў зямлі (з іх 500 тысяч ляснога масіву) на тэрыторыі Беларусі знаходзіцца ва ўладанні Міністэрства абароны СССР, калі гаварыць канкрэтна — ЧБВА. З гэтага рэспубліка не мае ні капейкі. Зараз ствараецца камісія, якая павінна будзе вызначыць: якую тэрыторыю, у якім аб'ёме неабходна вярнуць сельскай гаспадарцы. У сувязі з аварыяй на ЧАЭС у нас няма ніводнага лішняга гектара. Гэта—справа бліжэйшай будучыні.

Што мы маем цяпер? Прыняты шэраг законаў, вызначаны канкрэтныя напрамкі работы па іх рэалізацыі. І ў гэтай сувязі, гаварылася на сустрэчы, галоўнай функцыяй Камісіі Вярхоўнага Савета БССР па аграрных пытаннях, прадуктах харчавання і сацыяльнаму развіццю сяла становіцца не столькі заканатворчая, колькі кантрольная. Інакш усе прынятыя праграмы, законы застануцца на паперы.

А. СЛАНЕЎСКІ.

ЧАС ПАДПІСАННЯ У ДРУК: ПА ГРАФІКУ 21.05, НУМАР ПАДПІСАНЫ У 21.05.

Закон Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

Аб эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтве

Гэты Закон рэгулюе маёмасныя адносіны паміж суб'ектамі, якія ажыццяўляюць гаспадарчую і іншую дзейнасць пры эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтве любога з іх з мэтай максімальна магчымага задавальнення ўзаемных прэтэнзій усіх зацікаўленых бакоў.

Закон распаўсюджваецца на маёмасныя адносіны юрыдычных і фізічных асоб, якія займаюцца на тэрыторыі Беларускай ССР гаспадарчай дзейнасцю незалежна ад форм уласнасці, уключаючы суб'ектаў гаспадарання іншых саюзных рэспублік і замежных дзяржаў.

Раздзел I. Маёмасная адказнасць суб'екта гаспадарання

Артыкул 1. Усе суб'екты гаспадарання нясуць поўную маёмасную адказнасць па сваіх абавязацельствах, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам.

Маёмасная адказнасць суб'екта гаспадарання распаўсюджваецца на маёмасць, якая належыць яму на праве ўласнасці або на праве валодання, карыстання, распараджэння ў межах, установленых уласнікам або заканадаўчымі актамі Беларускай ССР.

Артыкул 2. Маёмасць суб'ектаў гаспадарання складаецца з матэрыяльных, фінансавых і нярэчыўных актываў.

У састаў матэрыяльных актываў уваходзяць асноўныя фонды і абаротныя сродкі.

Да фінансавых актываў адносяцца:

касавая наяўнасць, дэпазіты ў банках, укладыі, чэкі, разліковыя дакументы ў дарозе, страхавыя полісы, пасведчанні і іншыя страхавыя дакументы;

укладанні ў дзяржаўныя або іншыя каштоўныя паперы;

спажывецкі крэдыт, які прадастаўляецца суб'ектам гаспадарання сваім работнікам;

паі і долевыя ўклады ў маёмасці іншых суб'ектаў гаспадарання;

іншыя фінансавыя актывы.

Нярэчыўныя актывы складаюць:

гандлёвыя маркі і знакі, назвы, патэнты, пакеты дакументаў, ноу-хау, іншыя віды інтэлектуальнай уласнасці;

маёмасныя правы на карыстанне рэсурсамі;

іншыя нярэчыўныя актывы.

Артыкул 3. Фізічныя асобы нясуць маёмасную адказнасць па абавязацельствах прадпрыемстваў, уласнікамі якіх яны з'яўляюцца, у межах статутнага фонду прадпрыемства. Фізічныя асобы, якія ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць, не ствараючы юрыдычную асобу, нясуць адказнасць па сваіх абавязацельствах усёй сваёй маёмасцю. Маёмасць, на якую не можа быць накіравана спагнанне, вызначаецца заканадаўствам Беларускай ССР.

Артыкул 4. Асобы, якія працуюць па найму, не нясуць маёмаснай адказнасці па даўгах суб'ектаў гаспадарання.

Артыкул 5. Справы аб маёмаснай адказнасці, звязаныя з эканамічнай неплацежаздольнасцю або банкруцтвам суб'ектаў гаспадарання, разглядаюцца судом.

Раздзел II. Эканамічная неплацежаздольнасць суб'екта гаспадарання

Артыкул 6. Эканамічная неплацежаздольнасць — гэта засведчаная судом няздольнасць суб'екта гаспадарання аплаціць прад'яўленыя фінансавыя дакументы.

Артыкул 7. Вядзенне справы аб эканамічнай неплацежаздольнасці ажыццяўляецца з мэтай урэгулявання ўзаемаадносін суб'екта гаспадарання і крэдытораў, прадастаўлення права суб'екту гаспадарання прадоўжыць сваю дзейнасць.

Артыкул 8. Падставай для ўзбуджэння вядзення справы аб эканамічнай неплацежаздольнасці з'яўляецца:

няздольнасць суб'екта гаспадарання своечасова аплаціць прад'яўленыя фінансавыя дакументы;

перавышэнне вартасці даўгавых абавязацельстваў над вартасцю маёмасці суб'екта гаспадарання;

прызнанне суб'ектам гаспадарання сваёй эканамічнай неплацежаздольнасці.

Артыкул 9. Вядзенне справы аб эканамічнай неплацежаздольнасці ўзбуджаецца:

па заяве крэдытора;

па заяве суб'екта гаспадарання аб сваёй эканамічнай неплацежаздольнасці.

Артыкул 10. Пры падачы суб'ектам гаспадарання заявы ў суд аб сваёй эканамічнай неплацежаздольнасці неабходна:

для дзяржаўных прадпрыемстваў — рашэнне ўласніка (упаўнаважанага ім органа) і савета (праўлення) прадпрыемства;

для прадпрыемстваў, заснаваных на калектыўнай уласнасці, — рашэнне ўласнікаў, якія валодаюць не менш чым дзвюма трацямі вартасці маёмасці прадпрыемства;

для прадпрыемстваў, заснаваных на прыватнай уласнасці, — рашэнне ўласніка;

для сумесных прадпрыемстваў і прадпрыемстваў, заснаваных на змешаных формах уласнасці, — рашэнне ўласнікаў, якія валодаюць не менш чым дзвюма трацямі вартасці маёмасці прадпрыемства, або ўпаўнаважаных імі органаў.

Аб рашэнні суб'екта гаспадарання прызнаць сваю эканамічную неплацежаздольнасць паведамляецца працоўнаму калектыву.

Артыкул 11. Да вынясення рашэння суда суб'ект гаспадарання мае права прадаўжаць сваю гаспадарчую дзейнасць.

Артыкул 12. Пры падрыхтоўцы справы аб эканамічнай неплацежаздольнасці да слухання суд назначае экспертызу фінансава-гаспадарчай дзейнасці суб'екта гаспадарання.

Экспертам можа быць прадстаўнік Камітэта па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю пры Савеце Міністраў Беларускай ССР або юрыдычная ці фізічная асоба, якой бакі прадстаўляюць па ўзаемнай дамоўленасці права на правядзенне экспертызы. Пры адсутнасці згоды аднаго з бакоў эксперт назначаецца судом.

У працэсе правядзення экспертызы неабходна:

ажыццявіць аналіз фінансавага стану суб'екта гаспадарання;

вывучыць абгрунтаванасць патрабаванняў крэдыторaў;

устанавіць прычыны эканамічнай неплацежаздольнасці суб'екта гаспадарання;

прадставіць суду заключэнне аб выніках экспертызы, а таксама план урэгулявання ўзаемаадносін паміж суб'ектам гаспадарання і крэдыторамі.

Артыкул 13. План урэгулявання ўзаемаадносін паміж суб'ектам гаспадарання і крэдыторамі можа прадугледжваць наступныя меры:

чарговасць задавальнення прэтэнзій;

адтэрміноўку да аднаго года тэрміну задавальнення прэтэнзій;

выдзяленне неадкладных прэтэнзій і парадак іх задавальнення;

прапарцыянальнасць задавальнення прэтэнзій;

частковы распродаж маёмасці суб'екта гаспадарання;

рэарганізацыю суб'екта гаспадарання;

іншыя меры.

Артыкул 14. У выпадку, калі справа аб эканамічнай неплацежаздольнасці ўзбуджаецца па заяве самога суб'екта гаспадарання, ён можа быць надзелены судом дадатковымі правамі. У прыватнасці, суб'екту гаспадарання можа быць прадастаўлена права:

прадставіць у суд уласны план урэгулявання ўзаемаадносін з крэдыторамі і іншымі зацікаўленымі ў справе суб'ектамі гаспадарання;

атрымаць пазыку або фінансавую дапамогу са спецыяльнага фонду гаспадарчай рызыкі, калі такі ёсць;

атрымаць адтэрміноўку выканання пацверджаных даўгавых абавязацельстваў тэрмінам да трох гадоў.

Артыкул 15. У выніку слухання справы аб эканамічнай неплацежаздольнасці суб'екта гаспадарання суд мае права:

адхіліць іскавыя патрабаванні крэдыторaў;

прызнаць іскавыя патрабаванні крэдыторaў абгрунтаванымі, суб'екта гаспадарання — эканамічна неплацежаздольным, але адтэрмінаваць выкананне ўсіх або асобных пацверджаных даўгавых абавязацельстваў, калі эканамічная неплацежаздольнасць настала па аб'ектыўных прычынах і з'яўляецца часовай, а таксама прызнаць несапраўднымі, спыніць або адтэрмінаваць выкананне тых гаспадарчых пагадненняў, якія прывялі суб'екта гаспадарання да эканамічнай неплацежаздольнасці;

прызнаць іскавыя патрабаванні крэдыторaў абгрунтаванымі, суб'екта гаспадарання — эканамічна неплацежаздольным, узбудзіць справу аб банкруцтве.

Аб'ектыўнымі прычынамі могуць быць:

стыхійныя бедствы;

прызнанне судом заключанай здзелкі несапраўднай;

змяненне дзяржавай эканамічных метадаў рэгулявання гаспадарчай дзейнасці суб'екта гаспадарання;

іншыя прычыны, прызнаныя судом.

Артыкул 16. На любым этапе разгляду справы аб эканамічнай неплацежаздольнасці адказчык можа ўнесці вызначаны судом залог. У гэтым выпадку вядзенне справы прыпыняецца на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 17. У выпадку, калі план урэгулявання ўзаемаадносін паміж суб'ектам гаспадарання і крэдыторамі ўключае частковы распродаж маёмасці, то яго распродаж ажыццяўляецца даўжніком пад кантролем упаўнаважанай судом асобы.

Артыкул 18. У выпадку адхілення патрабаванняў крэдыторaў па іску да суб'екта гаспадарання суд вызначае размер кампенсацыі маральнага і матэрыяльнага ўрону, які падлягае спагнанню з іх на карысць адказчыка.

Артыкул 19. Па патрабаванню крэдытора суд у тэрміны, устаноўленыя заканадаўствам, можа перагледзець сваё рашэнне па новаадкрытых абставінах.

Артыкул 20. Справа аб эканамічнай неплацежаздольнасці лічыцца закончанай, калі даўжнік выведзены са стану неплацежаздольнасці або калі ўзбуджаецца справа аб банкруцтве.

Раздзел III. Банкруцтва суб'екта гаспадарання

Артыкул 21. Банкруцтва — гэта засведчаная судом поўная неплацежаздольнасць суб'екта гаспадарання.

Артыкул 22. Мэтай разбору справы аб банкруцтве з'яўляецца максімальна магчымае задавальненне прэтэнзій крэдыторaў, ліквідацыя неплацежаздольных суб'ектаў гаспадарання, аб'яўленне суб'екта гаспадарання свабодным ад даўгоў.

Артыкул 23. Падставай для ўзбуджэння справы аб банкруцтве з'яўляецца:

заява суб'екта гаспадарання аб сваім банкруцтве;

рашэнне суда аб узбуджэнні справы аб банкруцтве;

заява крэдытора, пададзеная пасля заканчэння ўстаноўленага судом тэрміну для ўрэгулявання ўзаемаадносін паміж крэдыторамі і суб'ектам гаспадарання.

Артыкул 24. Пры заяве суб'екта гаспадарання аб сваім банкруцтве неабходна:

для дзяржаўных прадпрыемстваў — рашэнне ўласніка (упаўнаважанага ім органа) і савета (праўлення) прадпрыемства;

для прадпрыемстваў, заснаваных на калектыўнай уласнасці, — рашэнне ўласнікаў, якія валодаюць не менш чым дзвюма трацямі вартасці маёмасці прадпрыемства;

для прадпрыемстваў, заснаваных на прыватнай уласнасці, — рашэнне ўласніка;

для сумесных прадпрыемстваў і прадпрыемстваў, заснаваных на змешаных формах уласнасці, — рашэнне ўласнікаў, якія валодаюць не менш чым дзвюма трацямі вартасці маёмасці прадпрыемства, або ўпаўнаважаных імі органаў.

Аб рашэнні суб'екта гаспадарання аб'явіць сябе банкрутам паведамляецца працоўнаму калектыву.

Артыкул 25. Пасля ўзбуджэння справы аб банкруцтве суд публікуе за кошт заяўніка ў афіцыяльных выданнях Урада Беларускай ССР і мясцовым друку аб'яву аб маючым адбыцца слуханні справы. У аб'яве павінны быць указаны:

назва і адрас суда;

назва і адрас суб'екта гаспадарання;

падстава для ўзбуджэння справы;

зварот да крэдытораў і зацікаўленых бакоў і тэрмін, у які яны могуць прад'явіць свае прэтэнзіі;

іншыя істотныя абставіны справы.

Артыкул 26. Патрабаванні крэдыторaў прымаюцца на працягу тэрміну, устаноўленага судом. Патрабаванні, заяўленыя пасля заканчэння ўказанага тэрміну, задавальняюцца з маёмасці прадпрыемства, якая засталася пасля задавальнення патрабаванняў, заяўленых у тэрмін.

Артыкул 27. Пасля ўзбуджэння справы аб банкруцтве суд можа назначыць па прадстаўленню крэдыторaў або па ўласнай ініцыятыве даверanую асобу для ажыццяўлення функцый кантролю і кіравання маёмасцю суб'екта гаспадарання.

Даверанай асобай можа быць фізічная або юрыдычная асоба, якая мае права на правядзенне такога віду работ.

Артыкул 28. Даверaная асоба мае права:

назначаць свайго бухгалтара і іншых асоб для вядзення справы;

прыцягваць экспертаў;

забараняць або дазваляць вытворчую дзейнасць суб'екта гаспадарання;

ставіць перад судом пытанне аб прызнанні несапраўднымі здзелак суб'екта гаспадарання, учыненых на працягу года да пачатку справы аб банкруцтве або да падачы заявы аб эканамічнай неплацежаздольнасці з мэтай утойвання маёмасці або ўхілення ад выплаты даўгоў, а таксама калі суб'ект гаспадарання атрымаў па здзелцы значна менш эканамічна абгрунтаванай цаны маёмасці, або калі суб'ект гаспадарання з'яўляўся неплацежаздольным.

Артыкул 29. Суб'ект гаспадарання абавязаны прадставіць даверанай асобе поўны спіс сваіх крэдыторaў і дэбіторaў з указаннем сумы запазычанасці, разгорнуты баланс актываў і пасіваў, справаздачу аб фінансавым становішчы, усю неабходную інфармацыю, якая змяшчаецца ў кнігах, рахунках і іншых дакументах.

Артыкул 30. У тэрмін, устаноўлены судом, даверaная асоба абавязана прадставіць заключэнне аб наяўнасці факта банкруцтва суб'екта гаспадарання.

Артыкул 31. З моманту прызнання суб'екта гаспадарання банкрутам:

прыпыняецца выплата дывідэндаў, падаткаў і плацяжоў;

не дапускаецца прад'яўленне новых патрабаванняў да яго;

лічацца закончанымі тэрміны пагашэння ўсіх даўгоў;

прыпыняецца вядзенне па ўсіх справах супраць банкрута, звязаных з маёмасцю.

Усе маёмасныя патрабаванні да банкрута могуць быць прад'яўлены толькі ў рамках справы аб банкруцтве.

Артыкул 32. Пры прыняцці рашэння аб прызнанні суб'екта гаспадарання банкрутам суд утварае ліквідацыйную камісію на чале з даверанай асобай.

Артыкул 33. Ліквідацыйная камісія абавязана:

паведаміць крэдыторам і зацікаўленым бакам аб ліквідацыі прадпрыемства-банкрута;

сканцэнтраваць грашовыя сродкі прадпрыемства-банкрута на адзіным рахунку ў адным банку;

скласці справаздачу аб маёмасці прадпрыемства-банкрута, уключаючы тую, што знаходзіцца пад залогам;

падрыхтаваць план яго ліквідацыі;

закончыць бягучыя справы;

ажыццявіць паэтапную ліквідацыю ўласнасці прадпрыемства-банкрута ў інтарэсах зацікаўленых бакоў;

прадастаўляць крэдыторам, суду, дзяржаўным кантралюючым і падатковым органам, іншым зацікаўленым арганізацыям і асобам неабходную інфармацыю аб маёмасці прадпрыемства-банкрута, аб ходзе працэсу ліквідацыі ўласнасці;

падрыхтаваць заключную справаздачу аб правядзенні ліквідацыі прадпрыемства-банкрута і прадставіць яе ў суд.

Артыкул 34. План ліквідацыі павінен адлюстроўваць:

поўную і аб'ектыўную карціну фінансавага стану прадпрыемства-банкрута;

умовы, парадак, чарговасць і прапарцыянальнасць задавальнення прэтэнзій крэдыторaў;

улік інтарэсаў уласніка прадпрыемства-банкрута, працоўнага калектыву;

пералік маёмасці, якая падлягае распродажу;

спосаб, месца і час распродажу маёмасці;

умовы аплаты судовых выдаткаў, дзейнасці экспертаў, членаў ліквідацыйнай камісіі, даверaных і іншых асоб.

Артыкул 35. З мэтай абароны сваіх інтарэсаў крэдыторы маюць права дзейнічаць праз сваіх прадстаўнікоў.

Прадстаўнікі крэдыторaў маюць права:

прадастаўляць інтарэсы крэдыторaў у судзе;

атрымліваць інфармацыю аб фінансавым стане прадпрыемства-банкрута, аб стане яго маёмасці;

ажыццяўляць кантроль за дзеяннямі даверанай асобы;

знаёміцца з планам ліквідацыі прадпрыемства-банкрута;

абскардзіць дзеянні даверанай асобы, ліквідацыйнай камісіі ў судзе.

Артыкул 36. План ліквідацыі прадпрыемства-банкрута павінен быць узгоднены з крэдыторамі і лічыцца адобраным, калі падтрыманы крэдыторамі, якія прадстаўляюць не менш дзвюх трацей сумы патрабаванняў. Калі план ліквідацыі не адабраецца, а крэдыторы не прадставілі ў вызначаны судом тэрмін уласны план ліквідацыі прадпрыемства-банкрута, то суд зацвярджае план, прапанаваны ліквідацыйнай камісіяй.

У выпадку, калі ініцыятарам узбуджэння справы быў сам суб'ект гаспадарання, то ён можа прадставіць свой план ліквідацыі прадпрыемства.

Артыкул 37. На падставе зацверджанага плана ліквідацыі ажыццяўляюцца распродаж маёмасці і задавальненне прэтэнзій да даўжніка ў наступнай чарговасці:

даўгавыя абавязацельствы пад залог маёмасці;

даўгавыя абавязацельствы па выплаце заработнай платы, аплаце працы экспертаў, членаў ліквідацыйнай камісіі, даверaных і іншых асоб, абавязацельствы, якія выцякаюць з працоўных праваадносін, судовыя выдаткі па дадзенай справе;

кантрактныя абавязацельствы па аплаце атрыманых прадпрыемствам тавараў, аплаце работ і паслуг, штрафаў і нявыстоек, падаткаў і плацяжоў у бюджэт;

незабяспечаныя абавязацельствы па аблігацыях і іншых відах каштоўных папер, выпушчаных для рэалізацыі сярод грамадзян, а таксама даўгавыя абавязацельствы перад банкамі;

абавязацельствы перад акцыянерамі і пайшчыкамі;

іншыя абавязацельствы даўжніка.

Артыкул 38. Распродаж маёмасці банкрута ажыццяўляецца пры дапамозе публічных таргоў, аб месцы і часе правядзення якіх ліквідацыйная камісія аб'яўляе ў афіцыяльных выданнях урада Беларускай ССР і мясцовым друку не пазней чым за дзесяць дзён да іх пачатку. Маёмасць даўжніка можа распрадавацца паэтапна, але заўсёды публічна і па эканамічна абгрунтаваных цэнах.

Артыкул 39. Атрыманыя ад продажу сумы размяркоўваюцца паміж крэдыторамі па плану ліквідацыі прадпрыемства-банкрута. Плацяжы павінны праводзіцца па меры продажу маёмасці даўжніка. Канчатковая выплата ажыццяўляецца пасля продажу ўсёй маёмасці ў адпаведнасці з планам ліквідацыі.

Аб правядзенні апошняй выплаты павінна быць публікацыя.

Артыкул 40. Правы асоб, працаваўшых на прадпрыемстве, якое ліквідуецца, рэгулююцца заканадаўствам Беларускай ССР.

Артыкул 41. Пры ліквідацыі прадпрыемства-банкрута незалежна ад чарговасці задавальнення прэтэнзій да даўжніка ажыццяўляецца капіталізацыя пачасовых плацяжоў, якія належаць выплаце з гэтага прадпрыемства ў сувязі з прычыненнем калецтва, іншага пашкоджання здароўя або са смерцю грамадзяніна.

Артыкул 42. Калі план ліквідацыі прадугледжвае выкуп маёмасці прадпрыемства і пагашэнне яго даўгоў працоўным калектывам, то распродаж маёмасці праз таргі не праводзіцца.

Артыкул 43. Астатак вартасці маёмасці, якая ліквідуецца, пасля задавальнення патрабаванняў крэдыторaў і аплаты расходаў па вядзенню справы атрымлівае даўжнік-уласнік маёмасці.

Не распрададзеная ў працэсе ліквідацыі маёмасць выкарыстоўваецца па ўказанню даўжніка-ўласніка.

Артыкул 44. Даўгавыя абавязацельствы, не задаволеныя за недахопам маёмасці, лічацца пагашанымі.

Артыкул 45. Пасля заканчэння працэсу ліквідацыі прадпрыемства ліквідацыйная камісія перадае заключную справаздачу на захоўванне ў адпаведны архіў, паведамляе ў Міністэрства фінансаў Беларускай ССР і ў Дзяржаўны камітэт Беларускай ССР па статыстыцы і аналізу для выключэння прадпрыемства з дзяржаўных рэестра і рэгістра Беларускай ССР. Пры ліквідацыі прадпрыемства, якое ажыццяўляе знешнеэканамічную дзейнасць, дадаткова паведамляецца Дзяржаўнаму камітэту Беларускай ССР па знешнеэканамічных сувязях і Банку знешнеэканамічнай дзейнасці Беларускай ССР.

Артыкул 46. З моманту выключэння прадпрыемства з рэестра дзяржаўнай рэгістрацыі Беларускай ССР яно лічыцца ліквідаваным, справа аб банкруцтве — спыненай, а даўжнік — свабодным ад даўгоў.

Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР
М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.

30 мая 1991 г. гор. Мінск.

Працоўная біяграфія Алены ДАШКЕВІЧ—адна з многіх падобных на Мінскай фабрыцы мастацкіх вырабаў. Прафесію аператара швейнага абсталявання яна атрымала ў прафтэхвучылішчы. Але на фабрыцы давялося яшчэ шмат вучыцца: у цэхах прадпрыемства ўстаноўлена складанае японскае абсталяванне.

Добра працуе Алена. Прадукцыя, якую вырабляе з сяброўкамі, карыстаецца вялікім попытам у нашай краіне і за яе межамі.

Фота Я. ПЯСЕЦКАГА.

ВЁСКА НА ЗАДВОРКАХ

Сведчаць лічбы

Дзяржкамстатам рэспублікі падведзены вынікі 1990 года па капітальнаму будаўніцтву. Іх аналіз сведчыць, што карэнных змен у структуры капітальных укладанняў па рэспубліцы пакуль што не адбылося. І, у прыватнасці, у размеркаванні іх гораду і вёсцы. Так, аб'ёмы жыллёвага і сацыяльна-культурнага будаўніцтва ў сельскай мясцовасці яшчэ значна адстаюць ад гарадскіх. У вёсцы летась у разліку на 1.000 жыхароў узведзена жылых домоў агульнай плошчай 345 квадратных метраў, а ў горадзе — 590, больш у 1,7 раза. За кошт дзяржаўных цэнтралізаваных капітальных укладанняў і сродкаў прадпрыемстваў у гарадах пабудаваны 81 працэнт жылля, у вёсцы, уключаючы сродкі калгасаў, — 28.

Практычна не змяніліся суадносіны паміж аб'ёмам жыллёвага будаўніцтва ў гарадскіх пасёлках і ў сельскай мясцовасці за апошнія 10 гадоў. Удзельная вага ўводу жылля ў вёсцы ў 1981—1985 гадах склала 26 працэнтаў, у 1986—1990 гг. — 28 і ў 1990 годзе знізілася да 23 працэнтаў.

У сувязі з высокімі цэнамі на асноўныя будаўнічыя матэрыялы, цяжкасцямі іх набыцця, будаўніцтвам падрадным спосабам штогод знікаюцца аб'ёмы індывідуальнага будаўніцтва. У 1990 годзе ў сельскай мясцовасці пабудавана за кошт сродкаў насельніцтва 165 тысяч квадратных метраў, у той час як у 60-я гады будавалася ў сярэднім за год 1.400 тысяч метраў, у 70-я — звыш 800 тысяч, 80-я — 240 тысяч квадратных метраў.

Падобным чынам характарызуецца і будаўніцтва іншых аб'ектаў невытворчага прызначэння. У разліку на 10.000 вучняў у 1986—1990 гадах у сельскай мясцовасці ў сярэднім за год будавалася агульнаадукацыйных школ на 281 месца, у гарадах — на 354, бальніц у сельскай мясцовасці — 1,35 ложка на 10.000 чалавек, у гарадах — 3,62.

Таму ў ходзе ажыццяўлення абмяркоўваемай на сесіі праграмы стабілізацыі эканомікі і сацыяльнай абароны насельніцтва рэспублікі, якой, дарэчы, прадугледжваецца прыярытэтнае забеспячэнне сельскай гаспадаркі матэрыяльнымі рэсурсамі, больш увагі павінна быць удзелена менавіта жыллёваму і сацыяльна-культурнаму будаўніцтву ў вёсцы, змяненню суадносін у будаўніцтве ўнутры самога аграпрамысловага комплексу.

Р. ЗАРЭЦАР.

Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

Аб прызнанні паўнамоцтваў народнага дэпутата Беларускай ССР, выбранага 2 чэрвеня 1991 года

Разгледзеўшы прадстаўленне Мандатнай камісіі, Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі пастанаўляе:

Прызнаць паўнамоцтвы народнага дэпутата Беларускай ССР САМУСЕВІЧ Раісы Мікалаеўны, выбранай 2 чэрвеня 1991 года ад Асіповіцкай гарадской выбарчай акругі № 304.

Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР
М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.

5 чэрвеня 1991 года. гор. Мінск.

У савеце Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі

У апошні час у радзе рэспубліканскіх газет змешчаны інтэрв'ю з прадстаўнікамі мінскага стачкома, у якіх яны выкладаюць сваю тактыку дзеянняў: гэта перавыбары прафсаюзных камітэтаў на ўсіх заводах, перш за ўсё, дзе створаны стачкомы. Сцвярджаецца, што тыя людзі, якім даверана прадстаўляць інтарэсы рабочых у стачачных камітэтах, могуць замяніць прафсаюзны актыў гэтых прадпрыемстваў.

У сувязі з гэтым прэзідыум савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі лічыць неабходным заявіць наступнае. Стварэнне і дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку прафсаюзаў, грунтуецца на Канстытуцыі, дзеючым заканадаўстве, іх статутах.

Парадак склікання прафсаюзных сходаў (канферэнцый), тэрміны паўнамоцтваў прафсаюзных камітэтаў, права прафсаюзнага сходу (канферэнцыі) перавыбраць прафком або асобных яго членаў да заканчэння гэтых тэрмінаў вызначаны статутамі галіновых прафсаюзаў. Прымаемыя рашэнні павінны вызначацца канкрэтнымі вынікамі работы прафкома па абароне правоў рабочых і служачых, ініцыятывай і прынцыповасцю пры заключэнні калектыўнага дагавора, кантролем за яго выкананнем. Галоўнае пры гэтым — ацэнка іменна дзелавых якасцей прафсаюзнага камітэта.

Патрабаванне ж стачкомаў аб перавыбарах прафкомаў — часта не што іншае, як сродак дасягнення палітычных мэт. Дасягнуць іх стачкомы маюць намер, як кажуць, рукамі прафсаюзных камітэтаў.

Некаторыя важныя пытанні дзейнасці працоўных калектываў могуць вырашацца толькі іх агульнымі сходамі (канферэнцыямі). Яны разглядаюць і праекты калектыўных дагавораў, змяненні, дапаўненні ў іх, упаўнаважваюць прафсаюзны камітэт падпісаць яго з адміністрацыяй. Права склікання агульнага сходу (канферэнцыі) працоўнага калектыву на тых прадпрыемствах, дзе няма СПК, зноў-такі належыць прафкому сумесна з адміністрацыяй. Іншым органам такога права не прадастаўлена.

Прафсаюзы Беларусі, іх органы не проціпастаўляюць сябе іншым грамадскім арганізацыям і рухам, якія ўдзельнічаюць у абароне правоў і законных інтарэсаў працоўных. Разам з тым прафсаюзы не могуць згадзіцца з прэтэнзіямі якіх-небудзь органаў і арганізацый на выключнасць, асобую ролю і адхіляюць дыктат, націск з чыйго б там ні было боку. У адпаведнасці з Законам СССР «Аб парадку вырашэння калектыўных працоўных спрэчак (канфліктаў)» орган, які ўзначальвае забастоўку, не мае права прымаць рашэнні, што адносяцца да кампетэнцыі грамадскіх арганізацый. Пры вырашэнні ўсіх пытанняў неабходна дзейнічаць ва ўстаноўленым парадку.

«МОЛАДЗЬ» АБАРОНІЦЬ

БАРЫСАЎ. (А. Дук). Яшчэ зусім нядаўна словазлучэнне «біржа працы» непрывычна рэзала наш слых. А сёння гэта наша рэальнасць.

Вядома, што моладзь увайшла ў рынак самай безабароннай з усіх слаёў насельніцтва. Каб неяк дапамагчы маладым спецыялістам, выпускнікам ПТВ, школ адаптавацца ў новых умовах, у горадзе на Бярэзіне створаны і дзейнічаюць сацыялагічная лабараторыя і біржа працы. Іх узнікненне прадугледжана праграмай «Моладзь», якая прынята на сесіі гарадскога Савета. З мясцовага бюджэту на выкананне гэтай праграмы прадугледжана амаль дзевяцьсот тысяч рублёў, свой уклад у некалькі тысяч зрабіў і гарком ЛКСМБ.

Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

АБ УВЯДЗЕННІ Ў ДЗЕЯННЕ ЗАКОНА БЕЛАРУСКАЙ ССР «АБ ЭКАНАМІЧНАЙ НЕПЛАЦЕЖАЗДОЛЬНАСЦІ І БАНКРУЦТВЕ»

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі пастанаўляе:

1. Увесці ў дзеянне Закон Беларускай ССР «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтве» з 1 ліпеня 1991 года.

2. Да прывядзення заканадаўства Беларускай ССР у адпаведнасць з Законам Беларускай ССР «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтве» акты дзеючага заканадаўства прымяняюцца, паколькі яны не супярэчаць дадзенаму Закону.

3. Закон Беларускай ССР «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтве» прымяняецца да праваадносін, якія ўзніклі пасля ўвядзення Закона ў дзеянне, гэта значыць з 1 ліпеня 1991 года. Па праваадносінах, якія ўзніклі да 1 ліпеня 1991 года, Закон Беларускай ССР «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтве» прымяняецца да тых правоў і абавязкаў, якія ўзнікнуць пасля ўвядзення Закона ў дзеянне.

4. Савету Міністраў Беларускай ССР:

распрацаваць і да 1 ліпеня 1991 года зацвердзіць Палажэнне аб умовах і парадку дзейнасці экспертаў і даверaных асоб у выпадках эканамічнай неплацежаздольнасці або банкруцтва суб'ектаў гаспадарання;

да 1 кастрычніка 1991 года прадставіць у Вярхоўны Савет Беларускай ССР прапановы па прывядзенню заканадаўчых актаў Беларускай ССР у адпаведнасць з Законам Беларускай ССР «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтве»; прывесці ў адпаведнасць з дадзеным Законам пастановы і распараджэнні ўрада Беларускай ССР; забяспечыць перагляд і адмену міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі і ведамствамі Беларускай ССР іх нарматыўных актаў, якія супярэчаць дадзенаму Закону.

Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР
М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.

30 мая 1991 г. гор. Мінск.

Надзвычайная ўвага да надзвычайных сітуацый

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

беспарадкаў. І нічога антыдэмакратычнага тут няма, калі мы сапраўды клапоцімся аб жыцці і здароўі людзей. Размова павінна ісці не аб тым, прымаць закон ці не, а аб тым, якім быць гэтаму закону. Адсутнасць закона здольная парадзіць толькі самавольства. Дэмакратыя па-за законам — гэта анархія.

Дай Бог, каб гэты закон ніколі не прымяняўся. Але наша жыццё багатае непрадказальнымі сітуацыямі, і не толькі ў палітычным плане.

А. Турок: Гэты праект не можа выклікаць нічога, акрамя абурэння і сораму. Калі размова ідзе пра аварыю на ЧАЭС, то няўжо ў кагосьці не хапіла паўнамоцтваў, каб адмяніць першамайскую дэманстрацыю, даць сапраўдную і своечасовую інфармацыю?.. Увядзенне закона дасць магчымасць звесці рахункі з усімі непажаданымі, і зноў усталюецца час славутага застою.

Г. Лавіцкі: Калі гаварыць аб прычынах рэпрэсій, то галоўная з іх — беззаконне. Паколькі размова ідзе аб стварэнні праваюй дзяржавы, павінны быць прадугледжаны меры па лакалізацыі і ліквідацыі любой надзвычайнай сітуацыі... Закон аб надзвычайным становішчы не толькі дае надзвычайныя правы, але і накладае сур'ёзную адказнасць на ўдзельнікаў падзей.

М. Сукач: Прыняцце гэтага закона азначае, што прадстаўнікі ўлады хочуць вярнуцца да старога дыктату дзеля выратавання свайго становішча... Гэты стары бальшавіцкі метад ужо неаднойчы выпрабоўваўся на народзе і нічога, акрамя шкоды, нам не прынёс... Уладзе прасіць у народа «дубінкі» больш чым нахабна.

С. Навумчык: Зноў робіцца спроба заткнуць горла галоснасці. Прычым не вызначаны нават тэрмін дзеяння закона.

І. Пырх: Прыняцце закона, паводле слоў яго ініцыятараў, выклікана неабходнасцю абараніць нашых людзей ад усіх стыхійных бедстваў, аж да замаху на дзяржаўны суверэнітэт. Фармулёўка дзіўная. Але ж ці не жывём мы ўсе семдзесят з лішнім гадоў у экстрэмальных умовах непадзельнай улады адной палітычнай партыі?

Прамоўцаў было больш двух дзесяткаў. Як бачым, меркаванні даволі палярныя — як заўсёды, калі размова датычыцца палітыкі.

Закон дэпутаты не прынялі. Застаецца паўтарыць словы Валерыя Ціхіні: барані нас Бог ад прымянення такога закона. Барані Бог ад такіх сітуацый. Больш пакуль што сказаць няма чаго.

***

Асноўнай падзеяй на сесіі ў пятніцу стала абмеркаванне праекта Закона БССР аб адукацыі. Ён прыняты ў першым чытанні.

Л. РЫЖАНКОВА.

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ АД 18 ДА 18 СУТАК

МІНСК

БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫМІ

МАЗЫР. (У. Рыгораў). Тут пры гарадскім цэнтры здароўя пачалі дзейнічаць дзве школы — дамашніх медыцынскіх сясцёр і юных медыкаў. Як расказвае яго галоўны ўрач С. Шапіра, мэтай іх з'яўляецца даць практычныя медыцынскія веды і навыкі людзям з тым, каб пры неабходнасці яны маглі аказаць медыцынскую дапамогу сабе, сваім родным і блізкім.

Акрамя таго, школы фарміруюць у насельніцтва здаровы спосаб жыцця, для чаго цэнтр выпусціў для слухачоў першую ў рэспубліцы ілюстраваную брашуру з метадычнымі матэрыяламі па лячэнню нетрадыцыйнымі метадамі: травамі, кактэйлямі, воднымі працэдурамі і г. д.

Выпускнікі школы юных медыкаў (а гэта вучні 10—11 класаў) атрымаюць права працаваць у бальніцах і паліклініках у якасці малодшага медперсаналу.

ПЛЫВУЦЬ НАРОДНЫЯ ГРОШЫ

І зноў не адбыліся выбары народнага дэпутата БССР па Гродзенскай — Горкаўскай выбарчай акрузе № 238.

У галасаванні прынялі ўдзел толькі 41,7 працэнта ад спісачнага саставу выбаршчыкаў. А на выбары дэпутатаў аблсавета ў той жа дзень прыйшло толькі 12 працэнтаў выбаршчыкаў. Дарэчы, колькі каштавалі гэтыя выбары? Як паведамілі ў гарсавеце, акруговай камісіяй было выдзелена 2.210 рублёў на зарплату вызваленых работнікаў, канцылярскія выдаткі, падрыхтоўку агітацыйных матэрыялаў, арэнду памяшкання і інш. Заўважым, што па гэтай акрузе выбары праводзяцца ўжо ў пяты раз. І з кожным разам усё больш падае актыўнасць як выбаршчыкаў, так і кандыдатаў у дэпутаты. А народныя грошы плывуць...

КАНАДСКІЯ ЖУРАВІНЫ Ў БЕЛАРУСІ

СМАРГОНСКІ РАЁН. (А. Дук). Калі пабываць у Канадзе смаргонцам давядзецца яшчэ няскора, то магчымасць паспрабаваць канадскіх журавін у іх з'явіцца ў самы бліжэйшы час. У мясцовым лясгасе закладваецца іх плантацыя.

А вось яшчэ добры прыклад таго, як трэба выкарыстоўваць няўдобіцы і забалочаныя глебы: 45 сотак занята пад лекавыя расліны. У лясніцтвах размешчаны тры пасекі, колькасць пчоласем'яў у іх даўно пераваліла за 100. Так што будзем з мёдам і з варэннем.

У СКІДАЛІ ТРАКТАР ПРАДАВАЛІ...

ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ. (Б. Пракопчык). Вадзіцель пажарнай часткі № 4 г. Скідаля В. Пілько вырашыў прадаць трактар. Але ўвесь фокус у тым, што ніякага трактара ў яго не было, а належыў ён іншаму чалавеку, які 5 гадоў збіраў яго са спісаных запчастак. Машына атрымалася на славу, і на яе паклалі вока два жыхары з Літвы. Яны зачасцілі ў Скідаль і нарэшце дамовіліся — не з гаспадаром трактара, а з Пілько.

Аперацыя пачалася ўвечары. У пажарнай частцы пачуўся тэлефонны званок: каля фермы ў в. Лакно гарыць стог саломы. Пілько разам з начальнікам каравула М. Самсонавым і пажарнікам А. Лазуком выехаў на месца здарэння, аднак выклік аказаўся беспадстаўным. Вартаўнік сказаў, што ніякага пажару не было. Пажарнікі селі ў машыну, але Пілько павярнуў не ў Скідаль, а ў бок в. Парэчча. Калегі здзівіліся: навошта? «Хутка зразумееце»,— адказаў ён. І вось машына даганяе трактар, які вядзе літовец. Той разлічваецца з Пілько за пакупку. Па 500 рублёў, каб маўчалі, атрымалі Самсонаў і Лазук, а 4 тысячы «бізнесмен» пакідае сабе. Але ўжо назаўтра кампанія давала паказанні ў міліцыі...

ВАДКАСЦЬ НЕ ЎСТАНОЎЛЕНА. УСТАНОЎЛЕНА СМЕРЦЬ!

МІНСК. Пасля сумеснага распіцця неўстаноўленай вадкасці ў сваёй кватэры знойдзены труп 53-гадовага М., рабочага Мінскага аўтазавода, а яго пляменнік, 30-гадовы рабочы трактарнага завода, сканаў у бальніцы хуткай дапамогі.

Думаецца, што гэтыя дзве жудасныя смерці — больш чым сур'ёзнае папярэджанне аматарам дыхлафосу, адэкалону і клапамору.

Выпуск падрыхтавалі: У. ГОЙТАН, І. КАРНЕЙ, С. СУЛКОЎСКІ, А. СЛАНЕЎСКІ, А. КОКТЫШ.
Нашы тэлефоны: 32-44-02, 32-60-13, 32-31-98.

РЭКАМЕНДАЦЫІ

па здароваму ладу жыцця ва ўмовах павышанай радыяцыйнай рызыкі

I. ЗБАЛАНСАВАНАСЦЬ ХАРЧАВАННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

Фактар харчавання, яго збалансаванасць можа з'явіцца рашаючым для нармалізацыі ў арганізме чалавека біяхімічных працэсаў, якія змяняюць уздзеянне знешняга і ўнутранага іанізуючага апраменьвання. Важна атрымліваць з ядой дакладную колькасць неабходных для арганізма рэчываў: бялкоў, тлушчаў, вугляводаў, вітамінаў, мінеральных рэчываў.

Прыводзім пералік прадуктаў і чарговасці па перавазе выкарыстання іх у рацыёне:

а) З крыніц бялка: мяса і мясныя прадукты: цяляціна, ялавічына, бараніна, трусяціна, свініна, кураціна.

Рыба і рыбныя прадукты: траска, судак, шчупак, мінтай, акунь, марскі карп, натаценія, скумбрыя, стаўрыда і прадукты з іх.

Асаблівая ўвага ў рацыёне павінна быць удзелена марской капусце як крыніцы ёду і неспецыфічнага сарбенту — альгінату.

Малако і малакапрадукты: сыр, тварог, смятана, смятанка, кефір, натуральнае малако, пры гэтым натуральнае малако наступных відаў: каровіна, казінае.

Бялок курыных яек не мае абмежаванняў да ўжывання. Цэлае яйка рэкамендуецца для дарослых адзін раз на тыдзень, для дзяцей — тры разы на тыдзень.

б) З крыніц тлушчаў.

З цвёрдых: свіны, сметанковае масла, маргарын, ялавічны і барановы тлушч.

З вадкіх: аліўкавы, сланечнікавы, кукурузны алей.

в) З крыніц вугляводаў: хлебабулачныя вырабы — хлеб пшанічны з мукі 2-га гатунку, жытнёва-пшанічны хлеб, жытнёвы, батоны з мукі 1-га і вышэйшага гатункаў.

Крупы: аўсяныя, «Геркулес», грэчневыя, ячневыя, рысавыя, пшанічныя, манныя.

г) З крыніц вітамінаў і мікраэлементаў:

Група 1. Прадукты, выражаныя сваімі антыаксідатнымі ўласцівасцямі: яблыкі, памідоры, салата, агуркі, кукуруза (гэтыя прадукты неабходна шырока выкарыстоўваць у рацыёне).

Група 2. Нейтральныя прадукты: морква, салодкі перац, бульба, слівы, абляпіха, вінаград, кізіл, маліна, чарэшня, парэчкі чорныя, грушы, персікі, гарбузы, дыні (гэтыя прадукты трэба шырока ўжываць пры наяўнасці ў рацыёне дастатковай колькасці антыаксідаў, г. зн. прадуктаў групы 1).

Група 3. Прадукты, якія валодаюць выражанымі прааксідатнымі ўласцівасцямі: рэвень, чырвоныя парэчкі (гэтыя прадукты падлягаюць выключэнню з рацыёну).

II. ПРЫНЦЫПЫ АРГАНІЗАЦЫІ ХАРЧАВАННЯ

Пры пражыванні ва ўмовах магчымага паступлення з ядой у арганізм прадуктаў ядзернага дзялення ў невялікай колькасці на працягу доўгага часу неабходным з'яўляецца захаванне наступных прынцыпаў:

1. Змяншаць паступленне радыенуклідаў у арганізм;
2. Узмацняць вывядзенне радыеактыўных рэчываў;
3. Выкарыстоўваць ахоўныя ўласцівасці яды;
4. Абагачаць рацыён мінеральнымі солямі з мэтай замяшчэння радыенуклідаў у арганізме і папаўнення дэфіцыту мікраэлементаў.

Разбяром больш падрабязна кожны з прынцыпаў.

1. Змяншэнне паступлення радыенуклідаў з ядой забяспечваецца:

— ачысткай караняплодаў ад лупін;
— старанным мыццём агародніны і садавіны;
— пры старанная апрацоўцы мяса і рыбы выдаленнем вантробаў, сухажылляў, касцей і галавы;
— выключэннем з меню мяса-касцявых булёнаў;
— папярэднім вымочваннем мяса на працягу 1—2 гадзін перад прыгатаваннем яды.

II. Узмацненне вывядзення радыеактыўных рэчываў:

1. Рэгулярнае вызваленне мачы і жоўці шляхам увядзення дадатковай вадкасці ў колькасці да 500 мл (морсы, сокі, кампоты і г. д.), прыёму настояў траў і пладоў, якія валодаюць слабым мачагонным і жаўцягонным дзеяннем (рамонак, святаяннік, сухацвет, крываўнік, мята, шыпшына, кроп, кмен, зялёны чай), піццё мінеральнай вады.

2. Рэгулярнае апаражненне кішэчніка, якое забяспечваецца выкарыстаннем прадуктаў, што ўтрымліваюць клятчатку (хлеб грубага памолу, проса, грэчка, ячныя і аўсяныя крупы, капуста, буракі, морква, чарнасліў), назначэннем адвараў ільну, крапівы, чарнасліву.

3. Звязванне радыенуклідаў пекцінамі (сокі з мякаццю, яблыкі, персікі, агрэст, журавіны, абрыкосы, слівы, чорныя парэчкі, клубніцы, вішні, чарэшні, дыні, цытрусавыя, зефір, джэмы, мармелад).

III. ВЫКАРЫСТАННЕ АХОЎНЫХ УЛАСЦІВАСЦЕЙ ЯДЫ

1. Бялкі павышаюць устойлівасць да хранічнага ўнутранага апраменьвання, паніжаюць усмоктванне радыенуклідаў, павышаюць рэзінстэнтнасць арганізма да інфекцыі. Колькасць бялку павінна быць павышана на 10 працэнтаў ад сутачнай патрэбы, што забяспечваецца ўжываннем мяса, малака і малочных прадуктаў, рыбы і морапрадуктаў, бялковага энпіту, яек.

2. Прадукты, багатыя поліненасычанымі тлустымі кіслотамі (алей, рыба, арэхі, насенне гарбуза або сланечніку).

3. Вітаміны: — А (шыпшына, морква, пятрушка, сельдэрэй, чарамша, цыбуля-парэй, таматы, салодкі перац, часнок, салата, чарнаплодная рабіна, абляпіха);

С (шыпшына, абляпіха, чорныя парэчкі, цытрусавыя, пятрушка, чарамша, салодкі перац);

— В (мяса, малочныя прадукты, дрожджы, хлеб, грэчка, чай, агародніна, садавіна);

— Е (алей, абляпіха, бабовыя, грэчка, кукуруза, зялёны гарошак, часнок, цыбуля, чорныя парэчкі, брусельская капуста, салата, морква);

— полівітамінныя прэпараты.

IV. УВЯДЗЕННЕ МІКРАЭЛЕМЕНТАЎ І МІНЕРАЛЬНЫХ СОЛЯЎ:

— ёд (марская капуста, крэветкі, кальмары, яйкі, авёс, грэчка, проса, бабовыя, кедравыя арэхі, радыс, морква, чарнаплодная рабіна); ёдаваная соль у канцы варкі пры закрытай накрыўцы;
— кобальт (шчаўе, кроп, зялёная цыбуля, рыба, морква, буракі, крапіва, журавіны, рабіна, чорныя парэчкі, арэхі, гарох, фасоля, боб);
— магній (цырновыя);
— калій (разынкі, курага, чарнасліў, арэхі, урук, морква);
— кальцый (тварог, сыр, ікра, яйкі, бабовыя);
— жалеза (мясныя і рыбныя стравы, яблыкі, салата, разынкі).

V. АБ ВЫКАРЫСТАННІ АЛКАГОЛЮ І ФІТАСТЫМУЛЯТАРАЎ АБМЕННЫХ ПРАЦЭСАЎ ВА ЎМОВАХ ДЗЕЯННЯ РАДЫЯЦЫЙНАГА ФАКТАРУ РЫЗЫКІ

Неабходна растлумачыць мэтазгоднасць выкарыстання алкаголю для вывядзення трапіўшых у арганізм (інкарпарыраваных) радыенуклідаў. Справа ў тым, што алкаголь стымулюе як працэс вывядзення, так і працэс накаплення і ўсмоктвання радыенуклідаў у арганізме чалавека.

Перш за ўсё трэба адзначыць, што для жыхароў зон жорсткага кантролю ўжыванне алкаголю супрацьпаказана, і толькі пры выездзе з зоны прымяненне алкаголю як актывізатара абменных працэсаў дапушчальнае. Аднак у гэтым выпадку дозы алкаголю для актывізацыі працэсаў вывядзення радыенуклідаў, як было паказана спецыяльнымі даследаваннямі, павінны быць малымі. Так, для мужчын гэта доза не павінна перавышаць 1 г, а для жанчын—0,5 г на 1 кг масы цела. Напрыклад, мужчына вагой 70 кг можа ў мэтах актывізацыі абменных працэсаў выпіць не больш 175 г, а жанчына масай 60 кг — не больш 75 г 40-працэнтнага алкагольнага напітку. Кратнасць прыёму такой дозы павінна быць аднаразовай у 10—14 дзён, паколькі на працягу гэтага перыяду назіраецца стымуляцыя актыўнасці абменных працэсаў. Пры перавышэнні кратнасці, наадварот, адбываецца іх прыгнёт і наступае супрацьалкагольны эфект павелічэння ўсмоктвання радыенуклідаў.

У сувязі з такім неадназначным дзеяннем алкаголю рэкамендуецца шырока прымяняць фітастымулятары абменных працэсаў, якія валодаюць антыаксідатнымі ўласцівасцямі. У якасці такіх натуральных стымулятараў мы рэкамендуем чай, адвары аўса і пшаніцы, напіткі на аснове крапівы, алоэ, пладоў рабіны, абляпіхі, шыпшыны, каранёў лакрычніку і адуванчыка, а таксама прадуктаў пчалярства: мёду, пылку, матаччына малачка.

Прыводзім рэцэптуру прыгатавання напіткаў з фітастымулятарамі антыаксідатнай накіраванасці.

Напітак рабінавы

5 сталовых лыжак пладоў дзікай рабіны заліць 1 л вады, кіпяціць 10 мінут, настаяць на працягу 2 гадзін, піць па паўшклянкі з 1 чайнай лыжкай натуральнага лёду.

Камбінаваны агульнаўмацоўваючы чай «Восень»

Плады шыпшыны — 3 чайныя лыжкі, плады абляпіхі — 3 ч. л., трава цвінтарэю — 3 ч. л., корань адуванчыка — 2 ч. л., корань лакрычніку — 1 ч. л. перамешваюцца і заліваюцца 1 л вады, гэты састаў кіпяціцца 10 мінут, настайваецца 1 гадзіну, працэджваецца. Піць рэкамендуецца па адной трэці шклянкі з 1—2 ч. л. мёду.

Напітак з аўса з яблыкамі

Авёс і сухія яблыкі перабраць, памыць. Заліць халоднай вадой, давесці да кіпення і настайваць 3 гадзіны ў цёплым месцы, адвар працадзіць, падаваць цёплым. Замест разынак можна выкарыстаць моркву, абляпіху, курагу. Вада — 1,5 л, авёс — 1 шклянка, яблыкі — 1 шклянка. Выхад—1 л.

Напітак з вотруб'я з рабінавым сокам

У кіпень засыпаць прасеяныя вотруб'і, давесці да кіпення, даць настаяцца на працягу 1 гадзіны, працадзіць. Дадаць цукар або мёд і сок рабіны. Падаваць цёплым. Замест і побач з сокам рабіны можна выкарыстаць сок чорных парэчак, малін, клубніц. Вада — 1,5 л, вотруб'і пшанічныя — 1 шклянка, рабіна — 1 шклянка, цукар — 2 сталовыя лыжкі (або мёд — таксама 2 ст. л.). Выхад — 1 л.

Адвар шыпшыны

Сушаныя плады шыпшыны добра памыць, здрабніць, засыпаць у кіпень, накрыць накрыўкай, варыць 10—15 мінут. Даць настаяцца 2—3 гадзіны. Адвар працадзіць праз 2—3 слаі марлі. Для паляпшэння смаку адвару ў яго дадаюць цукар або мёд. Вада — 1 л, шыпшына — 5 ст. лыжак, цукар або мёд — 3—4 ч. л. Выхад — 1 л.

Морс з журавін

З перабраных і памытых журавін адціснуць сок. Накрыць яго накрыўкай і паставіць у халадзільнік або ў цёмнае месца (халоднае). Жамерыны заліць гарачай вадой і кіпяціць 5—10 мінут. Затым працадзіць, дадаць цукар, ахаладзіць, змяшаць з журавінавым сокам. Можна выкарыстоўваць каліну. Вада — 1 л, журавіны — 1 шклянка, цукар — 0,5 шклянкі. Выхад — 1 л.

Разлік кампанентаў фітастымулюючых напіткаў прыведзены для сям'і з 4-х чалавек. Раніцай рэкамендуецца выкарыстоўваць напіткі з аўса, вотруб'я, увечары — на аснове ягад і пладоў.

Прапануемыя прынцыпы пабудовы рацыёнаў прайшлі эксперыментальную праверку з вялікай эфектыўнасцю.

VI. АХОВА АРГАНІЗМА АД СПАЛУЧАЛЬНАГА ДЗЕЯННЯ НІТРАТАЎ І РАДЫЕНУКЛІДАЎ

Улічваючы магчымасць спалучальнага дзеяння нітратаў і радыенуклідаў, нарматывы для БССР больш жорсткія ў 1,5—2 разы. Зніжэнне ўзроўню нітратаў у прадуктах раслінаводства толькі на карысць. Напрыклад, прамыўка і механічная ачыстка агародніны зніжаюць утрыманне нітратаў у сярэднім на 10 працэнтаў. Пры вымочванні на працягу адной гадзіны бульбы, морквы, сталовых буракоў, капусты ўзровень нітратаў зніжаецца на 25—30 працэнтаў, зялeніва (пятрушкі, сельдэрэю, шпінату, кропу, зялёнай цыбулі і інш.) — на 20 працэнтаў. Гэта звязана з вельмі добрай растваральнасцю ў вадзе амаль усіх соляў азотнай кіслаты. Аднак пры гэтым часткова страчваюцца і карысныя водараствaральныя комплексы прадуктаў.

Утрыманне нітратаў прыкметна змяншаецца і пры тэрмічнай апрацоўцы. Пры некаторых даследаваннях у вараным выглядзе бульбы іх на 80, а ў вараных караняплодах на 40—70 працэнтаў менш, чым у сырых. Зніжэнне нітратаў у гатовым прадукце ад зыходнага пры розных відах кансервавання адбываецца на 60—70 працэнтаў, пры ўмове, калі расол або марынад не выкарыстоўваецца ў яду.

Захоўваць агародніну трэба пры нізкіх тэмпературах, таму што ў цяпле нітраты ператвараюцца ў нітрыты, якія яшчэ больш небяспечныя для чалавека. Тыя, хто вырошчвае агародніну і бульбу на прысядзібных участках, павінны памятаць дзве ўмовы: па-першае, не захапляцца азотнымі, у тым ліку свежымі арганічнымі ўгнаеннямі, асабліва ў канцы вегетацыі. Забараняецца прымяненне вадкага аміяку і аміячнай вады пад пасевы бульбы. Па-другое, трэба ўлічваць асветленасць градак — не разбіваць іх у цяні, нельга рабіць густымі пасевы.

Карысна ведаць, што з лішкамі нітратаў дапамагаюць змагацца арганізму вітаміны С, А, В-6, а таксама малочныя прадукты.

VII. АРГАНІЗАЦЫЯ ДОБРАГА ЛЕТНЯГА АДПАЧЫНКУ, АСАБЛІВА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Асноўная рэкамендацыя — спрабаваць забяспечыць для сябе, а асабліва для дзяцей, адпачынак на працягу ўсяго лета.

Многія імкнуцца выехаць на адпачынак за межы вобласці. Такая мера апраўдана ў першую чаргу з пункту гледжання забеспячэння на нейкі перыяд чыстымі прадуктамі харчавання. Але трэба ўлічыць, што знаходжанне ў іншым ад звычайнага клімаце карысна не абсалютна ўсім, асабліва дзецям да 6 гадоў, паколькі далёка неабыякавая для іх перабудова арганізма, змена рэжыму дня, харчавання.

Сонечныя ванны. Трэба ў гэтай сувязі сказаць адназначна — мноства іх жыхарам Гомельшчыны не патрэбна, а для дзяцей яны нават супрацьпаказаны з-за хоць бы і нязначных, але ўсё ж дадатковых дозавых нагрузак. Загараць трэба, але ў першыя дні — па 2—3 мінуты і паступова даводзячы працягласць сонечных ваннаў да адной, максімум дзвюх гадзін. Лепшы час для загарання — з 10 да 12 гадзін дня.

У агульным комплексе аздараўленчых мерапрыемстваў сярод дзяцей, якія жывуць на тэрыторыях, што падвергліся радыяцыйнаму ўздзеянню, важнае значэнне мае рэжым дня, асабліва з мэтай павелічэння аб'ёму рухальнай актыўнасці, маючы на ўвазе 5—6-гадзінны штодзённы яе аб'ём з абавязковым уключэннем гульнявога кампаненту з прычыны спалучальнага фізічнага і псіха-эмацыянальнага ўздзеяння на растучы дзіцячы арганізм.

Суадносіны сну і бадзёрасці ў рэжыме сутак у дзяцей павінны складаць 1:1.

Начны сон працягласцю 10 гадзін, дзённы — 2 гадзіны, на харчаванне — 2 і 2 гадзіны — на пасіўны адпачынак у выглядзе настольных гульняў, чытання і г. д. Аб'ём рухальнай актыўнасці павінен быць раўнамерна размеркаваны на працягу перыяду бадзёрасці дзіцяці. Неабходнай умовай з'яўляюцца абавязковыя максімальныя заняткі фізкультурай і рухавымі гульнямі на свежым паветры пры абмежаваным уздзеянні сонечнага апраменьвання.

Прыкладны рэжым для дзіцяці ва ўмовах радыяцыйнага фактару (на летні перыяд)

Пад'ём	8.00
Ранішняя гімнастыка	8.00
Туалет	8.30—9.00
Снеданне	9.00—9.30
Спакойныя гульні, чытанне кніг	9.30—11.30.
Другое снеданне	1130—12.00.
Рухавыя гульні	12.00—13.00
Плаванне (вадаём, басейн).	13.00—14.00
Абед	14.00—14.30.
Дзённы сон	14.30—16.30
Рытмічная гімнастыка	16.30—17.00.
Пасіўны адпачынак, спакойныя гульні	17.00—18.00
Рухавыя гульні	18.00—19.00
Вячэра	19.00—19.30
Прагулкі ў лесе, скверы	20.30—21.30
Другая вячэра (кефір)	21.00—22.00
Начны сон	22.00—8.00

Пры пабудове рэжыму дня на працягу навучальнага года неабходнай умовай з'яўляецца абавязковае максімальнае правядзенне фізкультурных мерапрыемстваў на свежым паветры пры абмежаваным уздзеянні сонечнага апраменьвання, выключаючы пры гэтым стрэсавыя ўплывы.

Вельмі важна напомніць аб неабходнасці рухальнай актыўнасці чалавека, які жыве ва ўмовах уздзеяння радыеактыўнага фактару, паколькі гэта стымулюе абменныя працэсы і актыўны вывад радыенуклідаў з арганізма.

VIII. ПАВЫШЭННЕ ІМУННЫХ УЛАСЦІВАСЦЕЙ АРГАНІЗМА

Вышэйпералічаныя рэкамендацыі па правільнай арганізацыі свайго харчавання і адпачынку з'яўляюцца асноўнай умовай падтрымання на належным узроўні імуннай сістэмы, якая адыгрывае вялікую ролю ў абароне арганізма ад уздзеяння радыенуклідаў.

Апрача таго, рэкамендуюцца рэцэпты з наступных траў:

Плады рабіны звычайнай	— 4 г
Почкі сасны	— 1 г
Трава чабору	— 3 г
Трава святаянніку	— 4 г
Плады шыпшыны	— 9 г
Ліст маліны	— 4 г
Трава крываўніку	— 9 г
Корань адуванчыка	— 3 г
Плады глогу	— 9 г
Ліст брусніц	— 3 г
Вада	— да 1 літра

Рэкамендуецца прымаць у колькасці 15—20 г адзін раз у дзень пасля яды.

б) Полівітамінны адвар:

Ліст брусніц	— 2 г
Плады шыпшыны	— 12 г
Плады рабіны	— 10 г
Плады чарніц	— 8 г
Трава святаянніку	— 8 г
Ліст маліны	— 4 г
Плады глогу	— 4 г
Піжма	— 6 г
Вада	— да 1 літра.

Рэкамендуецца прымаць у колькасці 15—20 грамаў адзін раз у дзень да яды.

Заўвага:

Пры складанні рэкамендацый выкарыстаны матэрыялы Кіеўскага медыцынскага інстытута, метадычныя рэкамендацыі МАЗ СССР, даныя Маскоўскага цэнтра фіталогіі.

Гомельская абласная санэпідэмстанцыя.

(«Гомельская праўда» за 28 мая г. г.).

ШАНТАЖ

Вельмі ўжо не хацелася пераадольваць цяжкасці ратнай службы ваеннаму вадзіцелю радавому Алішэру Абдукарымаву. Дома, у далёкай ад Беларускай ваеннай акругі роднай Фергане,— цёпла, фрукты, агародніна, сябры гуляюць... А тут ледзь свет пад'ём, рабі тое, выканай гэта! І ўсё ў загадным парадку, па статуту. Ды і працаваць трэба з тэхнікай, яна без догляду не паедзе.

Незвычайная сітуацыя

Салдат вырашыў любымі сродкамі «прабівацца» дамоў. Не, ён не дэзерціраваў. За гэта адказваць прыйдзецца. Не мудруючы, пераклаў выкананне сваёй задумы... на ўласных бацькоў.

І паляцела з Магілёва ва Узбекістан прыдуманае ім ад імя «земляка-добразычліўца» пасланне: маўляў, група туракмесхецінцаў, якія ўцяклі ў Беларусь пасля міжнацыянальных сутычак у Ферганскай вобласці, вырашыла адпомсціць салдатам-узбекам тут, прама ў воінскай часці. Ратуйце сыноў, неадкладна дабівайцеся пераводу іх дамоў, не шкадуйце грошай на подкуп начальнікаў. Прамаруджанне вельмі небяспечна!..

А каб узмацніць эфект уздзеяння на дамачадцаў, асабліва бацьку, які служыў у Савецкай Арміі і проста мог не паверыць «вутцы», Абдукарымаў тут жа адпраўляе пісьмо бацькам саслужыўца-аднавяскоўца Рузімата Камілава: «Ратуйце сына, ратуйце ўсіх салдат-узбекаў!..»

Услед за гэтым юны шантажыст пасылае яшчэ тры пісьмы, дзе ўжо раіць бацькам: калі не можаце вырашыць на месцы перавод сыноў, то прывязіце ў Магілёў па трыццаць тысяч рублёў — і ўсё будзе ўладжана. Не дачакаўшыся патрабуемай сумы, збаўляе цану да пяці тысяч. І ў кожным пісьме ананімшчык папярэджвае бацькоў, што аб гэтым ніхто не павінен ведаць. Інакш сынам — смерць.

Бацькі і сваякі ў Фергане, вядома ж, захваляваліся, пачалі стукацца ва ўсе інстанцыі. Тады і заняліся пошукам «добразычліўца» следчыя органы. Ім не склала вялікай цяжкасці хутка выявіць аўтара...

Каментарый ваеннага пракурора Магілёўскага гарнізона падпалкоўніка юстыцыі Мікалая КАСЦЮКОВА:

— Мы вырашылі не ўзбуджаць крымінальнай справы супраць ваеннаслужачага Алішэра Абдукарымава. Яго дзеянні не прывялі да цяжкіх вынікаў, да таго ж улічылі раскаянне і ўзрост.

Здзіўляе іншае: дзеля ўласнага дабрабыту гэты малады чалавек не пашкадаваў бацькоў, перапалохаў землякоў. Хочацца верыць, што гэта не яны выхавалі ў ім якасці, якія ледзь не прывялі хлопца на лаву падсудных. Вось такімі «вуткамі» часам і сеюць недавер'е да арміі. Думаю, што камсамольская арганізацыя, а Алішэр член ВЛКСМ, дасць ацэнку яго паводзінам.

Дэзерцірамі і «ўхілістамі» сёння, на жаль, здзівіць цяжка. Хоць, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі, у БВА іх працэнт невысокі. Мы рашуча выкараняем такія праступкі, вінаватых прыцягваем да крымінальнай адказнасці. Ваенныя юрысты пастаянна выступаюць у часцях і падраздзяленнях з растлумачэннямі законаў. Але аднымі гэтымі мерамі не абысціся. Пара ўжо бацькам успомніць аб адказнасці за выхаванне сваіх сыноў. Час па-сапраўднаму наладжваць патрыятычную работу ў школах, навучальных установах. Бо іменна патрыятызмам заўсёды была моцная наша многанацыянальная краіна.

М. НАЗАРОВІЧ, кар. БЕЛТА.

Гараскоп на тыдзень

КАТМАНДУ, 7. (Кар. ТАСС Дзмітрый Макараў — спецыяльна для «Звязды»). Падобна, зоркі не даруюць легкадумных адносін да астралогіі. Варта было ў мінулым гараскопе крыху іранічна адазвацца аб прагнозах паважанага Дамадара Лахані, як аўтару «спусцілі» недвухсэнсавае папярэджанне. Відаць, для прафілактыкі — каб не сумняваўся ў магчымасцях нябесных свяцілі. Астролаг паабяцаў Скарпіёну з сярэдзіны тыдня «праблемы, якія прынясуць нямала клопатаў». У сераду ўрачы ўстанавілі карэспандэнтумалаверу малярыю. Няёмка пісаць пра самога сябе, але трэба. Бо ўрывацца ў чужое асабістае жыццё было б зусім няёмка, а нам патрэбен чалавечы фактар. Для абмену вопытам. Так што, цяпер ніякіх жартаў. Наступны сігнал можа быць і больш крутым.

КАЗЯРОГУ (22 снежня — 20 студзеня) астролаг прадказвае «шматабяцаючы пачатак тыдня». Аднак надзеі не збудуцца. Узнікнуць нечаканыя праблемы. Астролаг лічыць, што вам трэба працаваць над сабой, улічваць усе свае памылкі, каб не паўтараць іх. Будзьце асабліва ўважлівымі да здароўя з 10 па 12 чэрвеня. У чацвер «магчымы стрэсавы стан».

У ВАДАЛЕЯ (21 студзеня — 19 лютага) наперадзе спрыяльны тыдзень. Зоркі апякуюць вас. Вы заробіце шмат грошай, але ўсё растраціце. 11 і 12 чэрвеня будзьце напагатове, беражыце здароўе, пазбягайце рызыкоўных сітуацый. 13 чэрвеня астролаг абяцае вам добрыя навіны, прыўзняты настрой, прылів разумовай энергіі.

У РЫБ (20 лютага — 20 сакавіка) наперадзе перыяд «цяжкіх выпрабаванняў». Але вы, як заўсёды, справіцеся з імі і захаваеце свае пазіцыі. З пункту погляду фінансавага становішча — усё ў поўным парадку. Грошай пазычаць не давядзецца. Астролаг прадказвае вам «некаторыя няўдачы» 10 і 11 чэрвеня. Аднак з 12-га вам будзе спадарожнічаць поспех.

АВЕНУ (21 сакавіка — 20 красавіка) непальскі астролаг прадказвае «цяжкасці, звязаныя з асабістай уласнасцю». Улічваючы апошнія зводкі МУС, не перашкодзіла б павысіць пільнасць, праверыць надзейнасць замкоў, не адчыняць дзверы каму папала. Астролаг раіць вам стрымліваць эмоцыі, інакш магчымы сур'ёзны канфлікт на рабоце. На наступным тыдні вас чакае «цікавая забаўляльная праграма». Так што, мяркуючы па прагнозу, сумаваць не давядзецца.

ЦЯЛЕЦ (21 красавіка—21 мая) наблізіцца да сваёй запаветнай мары, дзякуючы гібкаму падыходу і ўменню хутка арыентавацца ў абстаноўцы, прымаць правільныя рашэнні. На рабоце ўсё ідзе выдатна. Аднак на наступным тыдні ў вас могуць узнікнуць цяжкасці, звязаныя з жыллём. У панядзелак жорстка кантралюйце свае расходы — яны пойдуць не на карысць. 11 і 12 чэрвеня Лахані абяцае вам забавы. 13-га магчымы прыбытак.

БЛІЗНЯТЫ (22 мая — 21 чэрвеня) губляюць працоўны энтузіязм і паступова аказваюцца ў палоне апатыі. І не дзіўна. Усе вашы наватарскія ідэі ўпіраюцца ў глухую сцяну неразумення. Проста рукі апускаюцца ў такой абстаноўцы. Вельмі многа штучных перашкод. Фінансавае становішча пакідае жадаць лепшага. З 11 чэрвеня расходы рэзка павялічацца.

РАКУ (22 чэрвеня — 23 ліпеня) на наступным тыдні неабходна ўзважваць кожны крок, кожнае слова, пастаянна быць напагатове. Страта пільнасці, гаворыць астролаг, можа «дорага каштаваць». Працуючым Ракам пакуль што не варта спадзявацца на павышэнне па службе і поспехі на рабоце. З 12 чэрвеня рэзка ўзрастуць грашовыя расходы. Можа ўдасца штонебудзь купіць?

ІЛЬВУ (24 ліпеня — 23 жніўня) будзе цяжкавата звесці канцы з канцамі. Шмат часу забіраюць бытавыя дробязі. І ўсё ж, астролаг заклікае вас да філасофскага спакою. «Устрымлівайцеся ад рэзкіх выказванняў: нейкая неасцярожная фраза можа быць выкарыстана супраць вас у будучым». Такія прагнозы, прызнацца, насцярожваюць.

ДЗЕВА (24 жніўня — 23 верасня) пачне тыдзень у прыўзнятым настроі, але не зможа захаваць яго да канца. Нечаканыя цяжкасці прымусяць вас панервавацца. Пастарайцеся справіцца з усімі важнымі справамі ў пачатку тыдня, пакуль зоркі будуць вам спрыяць. У наступную пятніцу вы адчуеце прыкметы вяртання аптымізму і набліжэнне хэпі энда.

ШАЛІ (24 верасня — 23 кастрычніка) пераадолеюць частку цяжкасцей. «Аднак вам не ўдасца пазбавіцца ўнутраных супярэчнасцей, набыць спакой і поўную яснасць розуму». Вы не зможаце вызваліцца ад цяжару мінулага. У некаторых можа ўзнікнуць праблема з уласнасцю. «Палітычныя дзеячы могуць разлічваць на даволі ўмераны поспех».

У СКАРПІЁНА (24 кастрычніка — 22 лістапада) з'явяцца новыя цяжкасці, якія дапоўняць тыя, што ўжо ёсць. А гэта не ўзнімае дух. Вы можаце вельмі пацярпець ад ілжывых абвінавачванняў, плётак. Першая палавіна тыдня пройдзе адносна спакойна. Але з 13 чэрвеня рыхтуйцеся да цяжкіх часоў.

СТРАЛЬЦУ (23 лістапада — 21 снежня) непальскі мудрэц прадказвае «змешаны» тыдзень. Вас чакаюць узлёты і падзенні, удачы і няўдачы. Усё прыкладна пароўну. Цяжкае выпрабаванне выпадае на вашу долю 10 чэрвеня. Супакойцеся, астролаг абяцае вам выдатную перамогу. У вас не будзе праблем са здароўем і грошамі. Канец тыдня прынясе ўдачу.

Тайм-аўт

Спартсмены— дзецям

У акцыю міласэрнасці — дапамогу дзецям, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай аварыі — уключыліся і беларускія спартсмены. Прафсаюзнае таварыства і Дзяржкамспорт Беларусі навялі масты дружбы са спартыўнымі калектывамі замежных краін, якія могуць і жадаюць дапамагаць «чарнобыльцам», аказваюць фінансавае і матэрыяльнае садзейнічанне калектывам фізкультуры, ДЮСШ рада раёнаў Гомельскай і Магілёўскай абласцей.

Нядаўна, напрыклад, Белсавет прафсаюзаў выдзеліў дзесяці школам з раёнаў жорсткага кантролю спартыўную форму, абутак, інвентар. Некалькі камплектаў медыцынскага інструментарыю, дзевяць тысяч шпрыцаў аднаразовага карыстання, атрыманых, дарэчы, з Германіі, будуць перададзены навучэнцам спецыялізаваных ДЮСШ алімпійскага рэзерву, якія выязджаюць на летні аздараўленчы перыяд за межы рэспублікі. Адна з лепшых аздараўленчых баз — «Стайкі» — плануе сёлета правесці незвычайныя зборы. Дзеці, якія прымуць у іх удзел, падужэюць, пройдуць медыцынскае абследаванне, пабываюць у музеях, тэатрах Мінска.

● «РОЙ» ● «ДАМСКІ КРАВЕЦ» ● «СМЕРЦЬ ПЕЛІКАНА» ● «АКТРЫСА»

ЗА ДВАЦЦАЦЬ ГАДОЎ работы ў кіно рэжысёр Свярдлоўскай кінастудыі Уладзімір Хаціенка зняў чатыры поўнаметражныя фільмы: «Адзін і без зброі», «У страляючай глушы», «Люстэрка для героя», «Спальны вагон». І вось цяпер на экраны рэспублікі выходзіць новая каляровая двухсерыйная мастацкая кінастужка «РОЙ», знятая па матывах аднайменнага рамана Сяргея Аляксеева. Гэта роздум аб мінулым і сучаснасці, аб прычынах і выніках жаданага і згубнага лёсу. У цэнтры карціны некальні пакаленняў сібірскага сялянскага роду. Галоўныя ролі выконваюць Уладзімір Ільін, Часлаў Сушкевіч, Іван Агафонаў, Віктар Смірноў, Барыс Галкін, Сяргей Паршын, Генадзь Гарбук.

ВЫКЛІЧА ЦІКАВАСЦЬ у гледачоў і новая каляровая мастацкая кінастужка «ДАМСКІ КРАВЕЦ» вытворчасці кінастудыі «Фора-фільм». Яна пастаўлена рэжысёрам Леанідам Гараўцом па матывах аднайменнай п'есы Аляксандра Баршчагоўскага.

Кіеў · 1941 года, верасень. Усюды ў горадзе развешаны аб'явы, у якіх фашысты загадваюць яўрэйскаму насельніцтву з'явіцца да раніцы наступнага дня на месца агульнага збору. Трэба мець пры сабе дакументы, грошы, каштоўныя рэчы і цёплае адзенне. Гых, хто не паслухаецца, расстраляюць. Але ніхто яшчэ не ведае, што ўсіх гэтых людзей, у тым ліку старых, дзяцей, жанчын, у любым выпадку чакае страшная смерць. А пакуль людзі на штосьці спадзяюцца, будуюць планы, думаюць, што ўзяць з сабой... Дзеянне карціны адбываецца на працягу тольні адной ночы — той самай ночы, калі ўсе рыхтуюцца, развітваюцца, перажываюць. Вось вялікая сям'я дамскага краўца Ісаака: дачка, нявестка, унукі. Гэты стары і мудры чалавек з чыстай душой і добрым сэрцам, відаць, адзіны з сям'і здагадваецца, што будучага ў іх няма.

У галоўных ролях заняты Інакенцій Смактуноўскі, Таццяна Васільева, Алена Казялькова, Алена Барзова, Марыя Смактуноўская.

АМАТАРАМ ДЭТЭКТЫЎНАГА ЖАНРУ адрасавана новая каляровая мастацкая кінастужка «СМЕРЦЬ ПЕЛІКАНА», створаная нямецкімі кінематаграфістамі. Аўтары сцэнарыя — Райнер Бер і Моніка Рунге, рэжысёр — Райнер Бер.

Муж і жонка Герда і Херберт Бахманы вырашылі развесціся. Але ўзнікла праблема—з кім будзе жыць дзіця. Муж хоча, каб Роберт застаўся з ім, і дзеля гэтага гатоў пайсці на ўсё. Вось тут і пачынае раскручвацца крымінальны сюжэт: Херберт збіў машынай чалавека, і пацярпеўшы памёр. Даведаўшыся ад мужа пра здарэнне, Герда паклялася маўчаць. На наступны дзень яна знайшла ў сваёй паштовай скрынцы канверт з выразкай з газеты, у якой расказвалася аб няшчасным вы-

Фільмы тыдня

падку, а затым ёй прыслалі і фатаграфію загінуўшага. Герду пачаў праследаваць мужчына, якога яна пазнала — гэта быў чалавек... з фатаграфіі...

У фільме здымаліся Жужа Ньертэш, Клаус-Петэр Цыле, Францыска Матус, Андрэас Шміт-Шалер.

НЯМЕЦКІМІ КІНАМАЙСТРАМІ створана таксама каляровая мастацкая кінастужка «АКТРЫСА». Яна пастаўлена рэжысёрам Зігфрыдам Кюнам па аднайменнаму раману Хеды Цынер.

Марыя Райне была актрысай драматычнага тэатра. Выходзячы на падмосткі ў ролі шылераўскіх гераінь, яна зачароўвала тэатралаў, увасабляючы на сцэне характэрныя рысы нямецкай нацыі. І знешне—белакурая, статная, дужая — яна поўнасцю адпавядала «нормам» чыстай нардычнай расы, была ідэалам нямецкай жанчыны. А гэта ў той час было вельмі важна — ішоў 1935 год, трэці год праўлення Гітлера. Але вось душа Марыі была далёкай ад «ідэалу»: чалавек страсны і незалежны, у разгар узаконенага антысемітызму яна пакахала артыста Марка Лівенталя. Той адказаў ёй узаемнасцю.

У ролях Карына Харфух, Андрэ Хеніке, Міхаэль Гвіздзек, Марцін Бранд.

НА ЗДЫМКУ: кадр з фільма «РОЙ».



Крыжаванка

Перакладзіце на беларускую мову наступныя словы.

Па гарызанталях: 5. Взгляд. 6. Уединение. 10. Дюйм. 11. Подседельник. 12. Хорек. 13. Шурин. 15. Обувь. 17. Пограничный курган. 19. Водосток. 20. Тоннель. 21. Крючок в одежде. 23. Пожатие. 25. Сережка. 27. Мгновение. 29. Изложение. 30. Охотничий пыж. 32. Распашник. 33. Шепот. 34. Плод дикорастущего дерева. 35. Кружок.

Па вертыкалях: 1. Действие, акт. 2. Страда. 3. Изъян. 4. Борзая. 5. Необыкновенное происшествие. 7. Горбыль. 8. Блюдце. 9. Вселенная. 14. Ужимка. 16. Опушка. 17. Кузнечик. 18. Струя. 22. Очертание. 23. Пион. 24. Зодчий. 26. Наст. 28. Ткань анатомическая. 29. Увертка. 31. Зов. 33. Сень.

Склаў Ф. БЯЛЯЕЎ.
г. Жодзіна.

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, ЗМЕШЧАНУЮ 1 ЧЭРВЕНЯ

ПРАГРАМА ТЭЛЕПЕРАДАЧ
З 10 ПА 16 ЧЭРВЕНЯ

10 чэрвеня, ПАНЯДЗЕЛАК

Праграма Беларускага тэлебачання

16.30. «Нязнайка ў Сонечным горадзе». Фільмы 1, 2, 3-ці, «Бач ты, масленіца!» Мультфільмы.
17.30. Дом для хлебароба. Вырашэнне жыллёвай праблемы ў калгасе «Пагранічнік» Берастаўіцкага раёна.
18.00. Фестываль фільмаў і тэлепраграм, прысвечаны 50-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны. «Дзеці Брэсцкай крэпасці».
18.30. «Гэта зямля твая». Фільм-канцэрт.
19.00. Панарама.
19.30. Наш каментарый. Гандляр і пакупнік.
19.40. Трыбуна. Партком у сучасных умовах. Прамая лінія.
20.45. Калыханка.
21.00. «Альфа-Альфа». Дак. фільм.
21.15. Вакальныя творы беларускіх кампазітараў выконвае Э. Пелагейчанка.
21.45. Спартыўны тэлекур'ер.
22.00. Ліра.

Першая агульнасаюзная праграма

6.30—9.05. Раніца.
15.00. ТСН.
15.15. «Сын». Мастацкі фільм. 1-я серыя.
16.25. «Увага: здымаю!»
16.40. Дак. фільм «Расія Ільі Глазунова».
17.35. Свет персанальных камп'ютэраў.
17.50. Хвіліны паэзіі.
18.00. «Палітычная геаграфія часоў перабудовы».
18.30. ТСН.
18.45. Па законах рынку. Рэпартаж з Устаноўчага з'езда міжбіржавага саюза.
19.15. «Вінцік і Шпунцік». Мультфільм.
19.35. «Адзін дзень аднаго года». Да гадавіны служэння патрыярха Маскоўскага і ўсяя Русі Алексія Другога.
19.50. Мастацкі фільм «Плач перапёлкі» («Беларусьфільм»). 1-я серыя.
21.00. Час.
21.40. М. дэ Фалья. Сем іспанскіх народных песень.
22.00. Хто ёсць хто. Тэледэбаты з кандыдатамі на пасаду Прэзідэнта РСФСР. Прамая лінія.
0.00. Іграе М. Плятнёў (фартэпіяна).
0.40. ТСН.
1.00. «Сэрцу мілы край». Фільм-канцэрт.
2.15—3.20. Мастацкі фільм «Плач перапёлкі». 1-я серыя.

Другая агульнасаюзная праграма

17.00. М. Талстой. Прашу слова.
17.15. Дакументальны экран Расіі.
18.30. «Сабачае жыццё». Перадача пра людзей, якія адмовіліся ад савецкага грамадзянства.
19.00. «Майстры». Алег Басілашвілі. «І працягваецца гульня...»
20.00. Весткі.
20.15. Добрай ночы, малышы!
20.30. «Імгненні...». Спявае К. Шаўрына.
21.00. Час (з сурдаперакладам).
21.40. На сесіі Вярхоўнага Савета СССР.
22.40. Дак. фільмы «Алтай. Поры года», «Пераадоленне».
23.00. Весткі.
23.15. Да выбараў Прэзідэнта Расіі.
0.25. «Ніхто не забыты, нішто не забыта».

11 чэрвеня, АЎТОРАК

Праграма Беларускага тэлебачання

8.30. Раніца рэспублікі. Інфармацыйны выпуск.
8.45. Фестываль фільмаў і тэлепраграм, прысвечаны 50-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны. «Сведка». 1-я серыя.
10.05. «Любоў і гнеў Чарнагорыі». Дак. фльм.
10.15. «Нявеста з Поўначы». Мастацкі фільм.
16.30. Экран дзіцячага фільма. «Мішук».
17.35. «Пра Ксюшу і Камп'юшу», «Страчаная Галактыка». Мультфільмы.
18.00. Фестываль фільмаў і тэлепраграм, прысвечаны 50-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны. «Галасы памяці».
18.25. «Шляхі, якія мы выбіраем». Клічаўскі саўгас-тэхнікум.
18.50. Наш каментарый. Васата на папялішчы.
19.00. Панарама.
19.30. Чарнобыльскія званы. Праблемы перасялення з забруджаных раёнаў Беларусі.
20.10. Рынак. Белкаапсаюз: крок да новых эканамічных адносін.
20.45. Калыханка.
21.00. Х летняя Спартакіяда народаў СССР. Самба. Жанчыны.
21.35. Беларускі тэхналагічны інстытут імя С. М. Кірава. Тэленарыс.
21.45. На сесіі Вярхоўнага Савета БССР.

Першая агульнасаюзная праграма

6.30. Раніца.
9.05. Мастацкі фільм «Плач перапёлкі». 2-я серыя.
10.15. «Вам, ветэраны...» Фільм-канцэрт. Успамінае І. С. Казлоўскі.
11.00. Дзіцячая гадзіна (з урокам французскай мовы).
12.00. ТСН.
12.15. Актуальны рэпартаж.
12.30. «Лясныя казкі». Мультфільм.
13.00. Відэаблок «Народная творчасць».
15.00. ТСН.
15.15. «Сын». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
16.25. Свет захопленых. «Аўта».
16.40. Дак. фільм «Вахтавікі».
17.00. Разам з чэмпіёнамі.
17.15. Дзіцячы музычны клуб.
18.00. «Інтэрдэтэктыў»: незалежная крыміналістычная экспертыза».
18.30. ТСН.
18.45. Кантакт-форум.
19.15. «Нэльсан Мандэла. Няма лёгкага шляху да свабоды».
19.50. Расія перад выбарамі: што абяцаюць прэтэндэнты?
21.00. Час.
21.40. Маст. фільм «Плач перапёлкі». 2-я серыя.
22.55. Музыка ў эфіры. Выбранае.
23.25. «Тагільская знаходка». Цыкл «Слова Андронікава».
0.30. ТСН.
0.50. «50×50». Музычнае тэлешоу.
2.25. Мастацкі фільм «Плач перапёлкі». 2-я серыя.

Другая агульнасаюзная праграма

8.00. Ранішняя гімнастыка.
8.20. Размінка для эрудытаў.
17.00. Грані. Мастацка-публіцыстычная праграма.
18.00. «Мы ўсе сучаснікі-людзі». Паэзія Н. Каржавіна.
18.45. Парламенцкі веснік Расіі.
19.00. «Выклік». Напярэдадні выбараў. Гаўрыіл Папоў —Анатоль Сабчак.
20.00. Весткі.
20.15. Добрай ночы, малышы!
20.30. Ключ да сусветнага рынку.
21.00. Час (з сурдаперакладам).
21.40. На сесіі Вярхоўнага Савета СССР.
22.40. «Пара сенакосная».
23.00. Весткі.
23.15. «За мільён у цябе нічога не будзе». Мастацкі фільм (Францыя).

12 чэрвеня, СЕРАДА

Праграма Беларускага тэлебачання

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. Фестываль фільмаў і тэлепраграм, прысвечаны 50-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны. «Сведка». 2-я серыя.
10.00. Ліра.
16.30. «Добры лес», «Тайна цацак», «Вер-не-вер». Мультфільмы.
17.15. «Мяцёлыч і Банцік». Спектакль тэатра лялек.
18.00. «Крымскі сезон». Дак. фільм.
18.30. Субяседнік. Ткачыха Талачынскай тэкстыльнай фабрыкі Н. С. Мішкарудная.
19.00. Панарама.
19.30. Наш каментарый. Расійскі выбар.
19.35. Працістаянне. Аэрапорт «Мінск-2»: як дзейнічае закон аб абароне спажывецкага рынку рэспублікі?
20.20. Ад сэрца да сэрца. Сустрэча з канадскімі бізнесменамі.
20.45. Калыханка.
21.00. «Мне далёка не ўсё роўна», «Захавальнік». Дак. фільмы.
21.45. На сесіі Вярхоўнага Савета БССР.

Першая агульнасаюзная праграма

6.30. Раніца.
9.05. Мастацкі фільм «Плач перапёлкі». 3-я серыя.
10.15. «Месца здарэння — Лёшкаў луг». Аб працэсе станаўлення індывідуальнай сялянскай гаспадаркі.
10.55. «Пявучая Расія». Мастацкі фільм. 1-я серыя.
12.00. ТСН.
12.15. 2-я серыя мастацкага фільма «Пявучая Расія».
13.30. «Умка шукае сябра». Мультфільм.
13.40. Творчасць народаў свету.
14.10. «Я бачу гэты стэп заснежаным». Аб малавядомай старонцы гісторыі Сталінградскай бітвы.
15.00. ТСН.
15.15. «Здзяйсненне жаданняў». Сустрэча з маладымі салістамі і галоўным дырыжорам мастацкім кіраўніком ДАВТа Саюза ССР А. Лазаравым.
16.45. Мастацкі фільм «Абаронца Сядоў».
17.30. «Але пад адною бядою згуртуецца наша Русь...» Аб адраджэнні маральнасці і культуры.
18.45. Канцэрт Дзяржаўнага ансамбля танца Сібіры.
19.50. Мастацкі фільм «Плач перапёлкі». 3-я серыя.
21.00. Час.
21.45. Мастацкі фільм «Раз на раз не прыходзіцца».
23.00. Кінапанарама.
0.30. ТСН.
0.50. Аперэта, аперэта. «Любоў і фантазія».
1.50. Мастацкі фільм «Плач перапёлкі». 3-я серыя.

Другая агульнасаюзная праграма

8.00. Ранішняя гімнастыка.
8.20. А. Караманаў. «Паэма перамогі».
17.00. Весткі.
17.05. «Мастак і смутны час». Прымаюць удзел В. Максімаў, А. Бітаў, Г. Дадамян, Л. Жухавіцкі.
17.50. «Мікіцкі хор». Музычны капуснік у тэатры М. Разоўскага.
19.00. Мультфільмы «Аранжавае горлачка», «Чароўная птушка».
19.30. Л. Бетховен. Сімфонія № 1.
20.00. Весткі.
20.15. Добрай ночы, малышы!
20.30. Х летняя Спартакіяда народаў СССР. Плаванне.
21.00. Час (з сурдаперакладам).
21.45. «Ніць Арыядны». Дак. фільм.
22.00. Званы Расіі. Дабрачынны вечар артыстаў тэатра сатыры.
23.00. Весткі.
23.15. Працяг дабрачыннага вечара.
0.00. «Першае каханне». Мастацкі фільм.

13 чэрвеня, ЧАЦВЕР

Праграма Беларускага тэлебачання

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. Фестываль фільмаў і тэлепраграм, прысвечаны 50-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны. «Яго батальён». 1-я серыя.
9.50. «Прыроды неацэнны дар». Дак. фільм.
10.15. «Лістапад у пару лета». Мастацкі фільм.
16.30. Экран дзіцячага фільма. «Поезд са станцыі дзяцінства». 1-я серыя.
17.35. «Пакацігарошак», «Казка пра старое рэха», «Дзіўны манеж». Мультфільмы.
18.00. Фестываль фільмаў і тэлепраграм, прысвечаны 50-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны. «Маленькія эпізоды з біяграфіі баявой песні». Часткі 1-я і 2-я.
19.00. Панарама.
19.30. Зачытайце маё пісьмо...
19.35. Аспекты. Калі ёсць на зямлі гаспадар.
20.25. Тыдзень беларускага ўрада. Служба інфармацыі Савета Міністраў БССР паведамляе...
20.45. Калыханка.
21.00. «І зноў музыка». Фільм-канцэрт.
21.45. На сесіі Вярхоўнага Савета БССР.

Першая агульнасаюзная праграма

6.30. Раніца.
9.00. Мастацкі фільм «Плач перапёлкі». 4-я серыя.
10.05. Дак. фільм «На возеры Арон».
10.25. «Аднойчы ў Кускове». Харэаграфічныя мініяцюры Л. Якабсона.
11.00. Дзіцячая гадзіна (з урокам англійскай мовы).
12.00. ТСН.
12.15. Паводле зводак МУС СССР.
12.30. «Абаронца Сядоў». Мастацкі фільм.
13.15. Разам з чэмпіёнамі.
13.30. Кінапанарама.
15.00. ТСН.
15.15. «Знайсці каханую». Мастацкі фільм.
16.20. Свет захопленых. «Дай лапу, сябар!»
16.35. Творы К. Дэбюсі, Ф. Шапена, А. Марчэла, І.-С. Баха. Выканаўца — Д. Башкіраў (фартэпіяна).
17.15. «Вожыкава вопратка». Мультфільм.
17.25. Фільм—дзецям. «Нямухінскія музыкі».
18.30. ТСН.
18.45. ...Да 16 і старэйшым.
19.25. «Недыпламатычныя гутаркі». У перадачы прымае ўдзел былы прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Маргарэт Тэтчэр.
19.55. Мастацкі фільм «Плач перапёлкі». 4-я серыя.
21.00. Час.
21.40. Дзелавы кур'ер.
21.55. Камера глядзіць у свет.
22.55. Музычны фестываль у г. Кальмар (Францыя).
23.50. «Пад знакам «пі». У перапынку **(0.50)**—ТСН.
1.35. «Ільінскі пра Зошчанку». Фільм-канцэрт.
2.40. Мастацкі фільм «Плач перапёлкі». 4-я серыя.

Другая агульнасаюзная праграма

7.30. «Брыдж». Тэлебіржа.
8.00. Ранішняя гімнастыка.
8.20. «Яшчэ раз пра каханне». Лірычны канцэрт.
8.45. «Свавольнікі». Мультфільмы (Венгрыя).
17.00. «Грані». Мастацка-публіцыстычная праграма.
18.00. «Ці магчымы раскол у КПСС?»
18.45. Парламенцкі веснік Расіі.
19.00. «Голас Азіі». Прэзентацыя II Міжнароднага конкурсу папулярнай музыкі і песні.
20.00. Весткі.
20.15. Добрай ночы, малышы!
20.30. «Голас Азіі». Частка 2-я.
21.00. Час (з сурдаперакладам).
21.40. Х летняя Спартакіяда народаў СССР. Плаванне.
22.05. «Шлях». Некалькі старонак з жыцця Героя Сацыялістычнай Працы Праскоўі Малінінай.
23.00. Весткі.
23.15. «Позняя сустрэча». Мастацкі фільм.

14 чэрвеня, ПЯТНІЦА

Праграма Беларускага тэлебачання

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. Фестываль фільмаў і тэлепраграм, прысвечаны 50-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны. «Яго батальён». 2-я серыя.
9.55. «Вечны круг». Кінанарыс.
10.10. «Позняя сустрэча». Мастацкі фільм (М).
16.30. Экран дзіцячага фільма. «Поезд са станцыі дзяцінства». 2-я серыя.
17.35. «Маленькія эпізоды з біяграфіі баявой песні». Часткі 3, 4, 5-я (фонд).
19.00. Панарама.
19.30. Наш каментарый. Прывід беспрацоўя.
19.35. Паказвае Гомель. Радзімічы.
20.05. Парламент: кантакты і кантракты. Першыя крокі супрацоўніцтва паміж БССР і Нарвегіяй.
20.45. Калыханка.
21.00. «Сяджу ля акенца...» Фільм-канцэрт.
21.30. «Зорка Максіма». Дак. фільм.
21.45. На сесіі Вярхоўнага Савета БССР.

Першая агульнасаюзная праграма

6.30. Раніца.
9.05. Мастацкі фільм «Плач перапёлкі». 5-я серыя.
10.10. Дзіцячы музычны клуб.
10.55. «Поця і Поціха». Мультфільм.
11.15. ...Да 16 і старэйшым.
15.00. ТСН.
12.15. «Раз на раз не прыходзіцца». Мастацкі фільм.
13.30. Музыка ў эфіры.
14.00. Камера глядзіць у свет.
15.00. ТСН.
15.15. Фільм — дзецям. «Лета ў заапарку».
15.40. Свет захопленых. «Дамком».
15.55. Мама, тата і я.
16.25. «Вам, ветэраны...» Па старонках перадачы «Пераможцы».
17.45. Палітычныя дыялогі. «Паспрабуйце мяне ад веку адарваць...» Аб адкрыцці грамадска-культурнага цэнтра пры Свярдлоўскім райкоме КПСС Масквы.
18.30. ТСН.
18.45. «Паданне пра Ігаравы паход». Мультфільм.
19.10. «Капіталізм з чалавечым абліччам». Тэленарыс.
19.50. Мастацкі фільм «Плач перапёлкі». 5-я серыя.
21.00. Час.
21.40. Паводле зводак МУС СССР.
21.55. «ВІД» прадстаўляе: «Поле Цудаў», «Музагляд», «Справа», МТБ. У перапынку **(23.55)**—ТСН.
1.10. Культура рускага замежжа.
2.00. Мастацкі фільм «Плач перапёлкі». 5-я серыя.

Другая агульнасаюзная праграма

7.00. Раніца дзелавога чалавека.
8.00. Ранішняя гімнастыка.
8.20. «Братка Трус і братка Ліс». Мультфільм.
8.30. «Спыніся, імгненне». Аб сустрэчы з ваеннымі карэспандэнтамі ў 1986 годзе.
17.00. «Вандроўнікі». Пра лёс савецкіх немцаў.
18.20. Невядомая Расія. «З душы сваёй накіды...»
18.50. Дак. фільм.
19.00. «Шчырая размова». Перадача з Палтавы.
20.00. Весткі.
20.15. Добрай ночы, малышы!
20.30. «Зона бедства. Хроніка адраджэння».
21.00. Час (з сурдаперакладам).
21.40. На сесіі Вярхоўнага Савета СССР.
22.40. «Свет персанальных камп'ютэраў».
23.00. Весткі.
23.15. «Пятае кола». Мастацка-публіцыстычная праграма.

15 чэрвеня, СУБОТА

Праграма Беларускага тэлебачання

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Слова ў слова». Фільм-канцэрт.
9.05. Футбол. «Дынама» (Брэст) — «Дынама» (Гянджа).
9.55. Запрашаем у казку. У. Граўцоў. «Прыгоды Міхея і Марціна».
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Шашачны клуб.
11.45. Відэафільм.
12.00. 20 мінут рэдактара.
12.20. «На сонца вяслую...» Жыццё і творчасць паэта В. Віткі.
13.25. «Пажывём — убачым» Маст. фільм.
14.40. Х летняя Спартакіяда народаў СССР. Самба. Мужчыны.
15.15. Пасланец міру. Сустрэча школьнікаў Беларусі і Бельгіі.
16.00. «Рака на асфальце». Спектакль Гродзенскага драматычнага тэатра.
17.20. Дом і гаспадар. Аб праблемах рэалізацыі зямельнай рэформы. Прамая лінія.
18.20. Запрашальны білет. Музычная праграма з удзелам мастацкіх калектываў сярэдняй школы № 102 г. Мінска.
19.00. Панарама.
19.35. Гала-канцэрт І Рэспубліканскага тэлеконкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні. У перапынку **(20.35)**— Калыханка.
22.30. «Соф'я Пятроўна». Мастацкі фільм.

Першая агульнасаюзная праграма

6.30. «І музыкі цудоўныя імгненні». Канцэрт.
6.55. Мультфільмы «Залатыя каласы», «Серабрысты званочак».
7.30. Рытмічная гімнастыка.
8.00. Ранішняя забаўляльная праграма.
8.30. ТСН.
8.45. А. М. Астроўскі, Н. Я. Салаўёў. «Свеціць, ды не грэе». Фільм-спектакль Малога тэатра Саюза ССР.
11.00. Ранішняя зорка.
12.00. Мультфільмы «Капрыза», «Дзень загадак».
12.30. «Доктар з Кургана». Дак. фільм.
13.00. «Вам, ветэраны...» Гады, пакаленні, песні.
13.45. Марафон-15.
15.00. ТСН.
15.15. «Хлопец з нашага горада». Мастацкі фільм.
16.40. Фотаконкурс «Зямля — наш агульны дом».
16.45. «Ангажэмент». Г. Міляр.
17.35. Мультфільм «Пчала Мая». 3-я серыя (Германія — Аўстрыя).
18.00. Міжнародная панарама.
18.45. Выступае ансамбль народнай музыкі «Нядзеля».
18.55. «Хуаніта ля Лярга». Мастацкі фільм (Іспанія).
21.00. Час.
21.40. «20 гадоў я чакаў гэтай сустрэчы». Б. Рубашкін.
23.30. ТСН.
23.45. Чэмпіянат Еўропы па лацінаамерыканскіх бальных танцах.
2.15. «Хуаніта ля Лярга». Мастацкі фільм (Іспанія).

Другая агульнасаюзная праграма

8.00. Ранішняя гімнастыка.
8.15. Відавочнае — неверагоднае.
9.00. Мультфільмы.
9.30. Відэаканал «Садружнасць».
12.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
14.00. «Бліскучы Дрэздэн». Аб выстаўцы твораў XVIII стагоддзя з Дрэздэнскай галерэі.
14.40. «Свавольнікі». Мультфільмы. Выпускі 9-ы і 10-ы.
14.45. Спорт для ўсіх.
15.00. Валейбол. Першынство сусветнай лігі. Зборная СССР — зборная ЗША.
16.00. «Здароўе» (з сурдаперакладам).
16.30. Крыніцы.
17.00. «Лапшадрон». Сатырычны спектакль Варонежскага ТЮГа.
18.15. «Другое мастацтва». Пра выстаўку ў Доме мастакоў.
18.45. Парламенцкі веснік Расіі.
19.00. Тэлепраграма «Сям'я».
20.00. Весткі.
20.15. Добрай ночы, малышы!
20.30. Х летняя Спартакіяда народаў СССР. Плаванне.
21.00. Час (з сурдаперакладам).
21.40. «Кветка папаратніка». Мультфільм для дарослых.
22.00. Тэма з варыяцыямі. «Дом на Поварскай». Музычны салон. Перадача 2-я.
23.00. Весткі.
23.15. «Вячэрніцы». Мастацкі фільм.

16 чэрвеня, НЯДЗЕЛЯ

Праграма Беларускага тэлебачання

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Соф'я Пятроўна». Мастацкі фільм.
10.15. Віцебскі фестываль мастацтваў «Наша спадчына». Канцэрт ансамбля «Фінскія салісты».
11.10. Вас выклікае Спартландыя.
12.25. «Агонь у жылах крэменю». Тэлеспектакль па аповесці В. Іпатавай.
13.35. Асілак. Прамая лінія.
14.25. «Людзьмі звацца». Міжнародны кангрэс беларусістаў у Мінску.
16.25. Для школьнікаў. Пра шахматы і шахматыстаў.
17.10. «Вуліца на тры дамы». Тэленарыс пра Героя Савецкага Саюза В. Міхайлава.
17.50. Справаздачны канцэрт выкладчыкаў і вучняў Мінскага вучылішча мастацтваў і культуры.
19.00. Панарама.
19.30. Выток песні. Сустрэча з землякамі народнага артыста СССР В. У. Роўды, народных артыстаў БССР М. Г. Захарэвіч, М. А. Казінца, народнага мастака БССР В. П. Шаранговіча.
20.15. У кадры і за кадрам.
20.45. Калыханка.
21.00. Я. Глебаў. «Альпійская балада». Спектакль Вялікага тэатра оперы і балета БССР.
21.45. «Каскад».
21.55. Рок-фестываль праграмы «Крок» і радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная».
23.55. Х летняя Спартакіяда народаў СССР. Самба. Мужчыны.

Першая агульнасаюзная праграма

9.00. Раным-рана.
10.00. На службе Айчыне.
11.00. Ранішняя забаўляльная праграма.
11.30. Клуб падарожнікаў.
13.00. Музычны кіёск.
13.30. Да Дня медыцынскага работніка. «Здароўе».
14.30. «Ведзі».
15.00. ТСН.
15.15. Мастацкі фільм «Веру ў каханне».
16.35. «Усе любяць цырк». Дрэсіроўшчык Н. Качакоў.
16.55. Хвіліны паэзіі.
17.05. Сельская гадзіна.
18.05. Народныя казкі і прытчы розных краін. «Асляня» (Францыя).
18.10. Уолт Дысней прадстаўляе...
19.00. Р. Шуман. «Арабескі».
19.10. «Блазан». Мастацкі фільм.
21.00. Час.
21.40. «Што? Дзе? Калі?»
22.40. Выступае цыганскі ансамбль «Рэнда».
22.55. Хранограф.
23.10. Футбольны агляд.
23.40. Валейбол. Першынство сусветнай лігі. Зборная СССР — зборная ЗША.
0.40. ТСН.
1.00. «Па старонках амерыканскага кіно». Кінаканцэрт.
1.40. «Мне ад кахання спакою не знайсці». Фільм-канцэрт.

Другая агульнасаюзная праграма

12.00. «Прасвятленне. Сон аб Фларэнскім».
12.50. Сустрэча з духаборамі Канады.
14.00. «НЛА: неаб'яўлены візіт». Перадача 11-я.
15.00. Чэмпіянат ЗША па баскетболу сярод прафесіяналаў НБА. «Індыяна Пейсерз» — «Бостан Селтык».
16.00. Фільмы рэжысёра Ю. Ледзіна. «Чырвонаваллёвая казарка», «Паўночны марскі коцік».
17.00. Гома саветыкус. «Хто скажа: не забі?»
17.50. Тэлефільм.
18.15. Другое мастацтва. Перадача 2-я.
18.45. Аўтарскае тэлебачанне. Частка 1-я.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Весткі.
20.15. Аўтарскае тэлебачанне. Частка 2-я.
21.00. Час (з сурдаперакладам).
21.45. Выступае фальклорнае трыо «Званы рускія».
22.00. «К-2 прадстаўляе».
22.40. «Фантазія ў стылі ракако». Мсціслаў Растраповіч.
23.00. Весткі.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

8 чэрвеня

Праграма Беларускага тэлебачання

8.30. Раніца рэспублікі.
8.40. «Чырвоны мастак». Кінанарыс.
8.50. Пісьмовы экзамен па алгебры за курс няпоўнай сярэдняй школы.
9.05. «Следапыт». Мастацкі фільм.
10.35. «Жылі-былі два каты». Музычны тэлеспектакль.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Футбол. КІМ (Віцебск)—«Ніва» (Вінніца). 2-гі тайм.
12.05. Інтэрэкран. Прадстаўляе Львоўская студыя тэлебачання.
13.15. Ад «Я» да «МЫ». Перадача з Брэста.
14.10. Метраном.
15.10. Футбол. «Днепр» (Магілёў) — «Тарпеда» (Запарожжа). 2-гі тайм.
16.00. Канцэрт пераможцаў II Рэспубліканскага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І. Жыновіча.
17.25. Тэлевізійны дзіцячы дзень. І. Хачу быць... мільянерам. 2. Маленькая музычная галерэя. Юны віяланчаліст Коля Гімалетдзінаў.
18.50. Глядзіце «Тэлеаўкцыён».
19.00. Панарама.
19.30. Фінал і гала-канцэрт удзельнікаў і гасцей Усесаюзнага конкурсу «Міс фота СССР-91». У перапынку **(20.45)** — Калыханка.
22.35. «Пяць хвілін страху». Мастацкі фільм.

Першая агульнасаюзная праграма

6.30. Канцэрт фальклорных калектываў.
6.50. «Бюро знаходак». Мультфільм.
7.30. Рытмічная гімнастыка.
8.00. Ранішняя забаўляльная праграма.
8.30. Наш сад.
9.00. ТСН.
9.15. «Пункт адліку». Прадпрымальніцтва і бізнес.
9.45. Фільмы рэжысёра Г. Натансона. «Валянцін і Валянціна».
11.15. Ранішняя зорка.
12.15. Спыніся, імгненне!
12.45. Танцуе В. Пісараў.
13.45. Тэлемост Масква — Лондан.
15.00. ТСН.
15.15. «Бурда модэн» прапануе...
15.45. Хвіліны паэзіі.
15.55. «Дзівак з 5 «Б». Мастацкі фільм.
17.45. Мультфільм «Пчала Мая». (Германія, Аўстрыя). 2-я серыя
18.10. Міжнародная панарама.
18.55. Мастацкі фільм «Яно».
21.00. «Час».
21.45. «Аперацыя «Петрасян». Творчы партрэт Яўгена Петрасяна.
23.45. «Кантакты, кантакты, кантакты». Музычная праграма.
1.15. ТСН.

Другая агульнасаюзная праграма

8.00. Ранішняя гімнастыка.
8.15. Спорт для ўсіх.
8.30. Руская мова.
9.00. «Ніжагародская элегія». Пра першага рускага мастака-фатографа А. О. Карэліна.
9.30. Відэаканал «Садружнасць».
12.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
14.00. «Вясёлыя медзведзяняты». Спектакль Цэнтральнага дзяржаўнага тэатра лялек.
15.00. Фільмы рэжысёра Ю. Ледзіна. «Белы мядзведзь».
15.55. «Віншуем з юбілеем». Канцэрт-прадстаўленне ў Доме кіно да юбілею кінастудыі імя М. Горкага.
17.00. «Камера даследуе мінулае». Дак. фільм. «Эпіцэнтр».
17.50. Тэатральны раз'езд. На спектаклях рэжысёра Л. Трушкіна.
18.45. Парламенцкі веснік Расіі.
19.00. Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі.
20.00. Весткі.
20.15. Добрай ночы, малышы!
20.30. Воднае пола. Суперфінал. ЦСК ВМФ — «Дынама» (Масква).
21.00. Час (з сурдаперакладам).
21.50. Да выбараў Прэзідэнта Расіі.
23.00. Весткі.
23.15. Крымінальны канал. Мастацкі фільм.

9 чэрвеня

Праграма Беларускага тэлебачання

8.30. Раніца рэспублікі.
8.40. «У стылі джаз-рэтра». Фільм-канцэрт.
9.05. Парады ўрача.
9.20. «Белы слон». Мастацкі фільм.
10.40. С. Лабазёраў. «Па-суседску мы жывём». Спектакль Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Бурацкай АССР.
12.40. Х летняя Спартакіяда народаў СССР. Самба. Жанчыны.
13.15. Танцуе «Белая Русь».
14.00. «Тартак». Мастацкі фільм паводле аповесці І. Пташнікава.
15.20. Кінаэкран-91. Чэрвень.
16.40. «Журботная памяць». Тэленарыс.
16.55. Тэатр песні Я. Паплаўскай і А. Ціхановіча і фонд «Зніч» імя П. М. Машэрава. Дабрачынны канцэрт.
19.00. Панарама.
19.30. «Тэлеаўкцыён». Прадстаўляюцца вырабы навучэнцаў ПТВ і маладых аўтараў. У перапынку — Калыханка.
21.15. Чалавек і прырода. «Гэта надакучлівая аса».
21.55. Крок.

Першая агульнасаюзная праграма

6.30. «Поўнач і зноў світанне». Дак. фільм.
7.00. Ранішняя зорка.
8.00. ТСН.
8.15. Рытмічная гімнастыка.
8.45. Тыраж «Спортлато».
9.00. Раным-рана.
10.00. На службе Айчыне.
11.00. Ранішняя забаўляльная праграма.
11.30. Клуб падарожнікаў.
13.00. Здароўе.
13.30. Новае пакаленне выбірае. «Юніёр-банк».
15.00. ТСН.
15.10. Народная творчасць.
17.10. «Шмат галасоў — адзін свет». «Курыца і кракадзіл». (Паўднёвая Афрыка).
17.15. Сельская гадзіна.
18.15. Уолт Дысней прадстаўляе...
19.00. Мультфільм «Матылёк».
19.45. Мастацкі фільм «Няхай я памру, божухна...»
21.00. Час.
21.45. Футбольны агляд.
22.15. Што? Дзе? Калі?
23.30. Хранограф.
23.45. Канцэрт - прэзентацыя акцыянернага таварыства «Аніс».
00.45. ТСН.

Другая агульнасаюзная праграма

8.00. На зарадку станавіся!
8.20. «Лабірынт». Мультфільм.
8.40. «Аддайце мне раку». Аб крытычнай экалагічнай сітуацыі на Сахаліне.
9.00. «Прыцягненне Зямлі». Музычная праграма.
9.30. Відэаканал «Садружнасць».
12.00. Нядзельны маналог. Ю. Нагібін.
12.10. Дак. фільм.
13.00. Расійская энцыклапедыя. Лосеўскія гутаркі. «Захапленне дыялектыкай».
14.00. «Кола фартуны». Мультфільм.
14.15. «Як я правёў лета».
14.55. Тэлемост: СССР—ЗША. Глабальнае пацяпленне клімату і жыццё біясферы.
16.00. «Чэхаўская вясна ў Ялце». Старонкі тэатральнага фестывалю.
17.30. Да выбараў Прэзідэнта Расіі.
17.45. Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі.
18.45. Аўтарскае тэлебачанне.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Весткі.
20.15. Аўтарскае тэлебачанне.
21.00. Час (з сурдаперакладам).
21.45. Мультфільмы для дарослых «Едзе», «Дробязь».
22.00. К-2 прадстаўляе.
23.00. Весткі.
23.15. Джэнтльмен-шоу.
23.45. Музычныя навіны.
0.00. Лёгкая атлетыка.

РАДЫЁ

9 чэрвеня

Апошнія паведамленні: 5.00, 6.00, 8.00, 12.00, 15.00, 16.00, 17.00, 19.00, 20.00, 22.00, 23.00.
6.15 — «Зямля і людзі». Праграма для сельскіх слухачоў. 7.00 — «Свет сёння». Інфармацыйны выпуск. 7.20 — канцэрт. 7.45 — «Дзесяць мінут сацыёлага». 8.30 — «Дарослым пра дзяцей». 8.45 — на радыёхвалі «Арлянят». 9.15 — «Добрай раніцы!» 10.00 — «Жадаю вам...». Канцэрт-віншаванне. 11.00 — «Па краінах і кантынентах». 11.30 — «У вольную часіну». Музычная праграма з удзелам артыстаў-аматараў. 12.00 — радыёстанцыя «Саюз». 12.30 — «У свеце слоў». 13.00 — радыёстанцыя «Беларуская маладзёжная». Праграма «Савецкай Арміі салдат». 14.00 — «Чалавек сярод людзей». 15.15 — «Прэм'ера песні». У. Прохараў, А. Лягчылаў. «Горыч-ягада» Выконвае В. Новікава. 15.30 — «Міжнародны агляд». 16.15 — «Крылы». Мастацка-публіцыстычная праграма. 17.15 — «Гучаць старадаўнія вальсы». 17.40 — «Спадчына». Радыёчасопіс. 18.00 — музычная праграма, прысвечаная калектыву Мінскага вытворчага тонкасуконнага аб'яднання імя Кісялёва. 19.31 — «Поп-хваля». Эстрадная праграма. 20.00 — «Дзень нашага жыцця». 20.15 — вячэрняя казка. 20.25 — А. Жук. «Паляванне на апошняга жураўля». Радыёспектакль. 21.40 — «У джазавых рытмах». Канцэрт. 22.15 — «Музыка і псіхатэрапія». 22.45 — «Спартыўны дзённік». 23.15 — «Музычная хваля».

НАДВОР'Е

8 чэрвеня

Усход, захад, даўжыня дня: Мінск — 4.39, 21.37, 16.58; Віцебск — 4.21, 21.35, 17.14; Магілёў — 4.29, 21.26, 16.58; Гомель — 4.34, 21.16, 16.42; Гродна — 4.55, 21.52, 16.57; Брэст — 5.06, 21.42 ,16.36.

Сёння ўдзень па рэспубліцы воблачнае з праясненнямі надвор'е, часам дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ў Гродна, Брэсце, Мінску — 16—18, Гомелі, Магілёве, Віцебску — 19—21 градус цяпла.

У наступныя двое сутак па рэспубліцы захаваецца няўстойлівае з дажджамі і навальніцамі надвор'е. Тэмпература паветра ўначы — 7—12, удзень — 15—20 градусаў цяпла.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ
СЁННЯ Ў НУМАРЫ

«Захаваем светлае імя — Ленінград». Зварот ЦК КП Беларусі да ленінградцаў.

«Лёс Расіі ў руках яе народа». Гутарка з В. Бакаціным.

Аб паляпшэнні інфармацыйных сувязей унутры КПСС.

Партыйнае жыццё: размова па сутнасці. **«Перавесці стрэлку на зялёны. Куды рухаецца поезд перабудовы?»**

«Рэамабіль узяў курс на Берлін...» Аб дапамозе нямецкіх медыкаў.

«У пошуках абнаўлення». Заметкі з рэспубліканскага семінара партыйнага актыву вышэйшых навучальных устаноў.

Старонкі гісторыі. **«Абвешчаная надзея, або Яшчэ раз аб падзеях 25 сакавіка 1918 года».** Заканчэнне.

Суботні інфармацыйны выпуск **«Рэпарцёр».**

Міжнародная, саюзная і рэспубліканская інфармацыя.

Афіша дня.

КІРАЎНІКІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ

Біржа—гэта мора складанасцей,

ДЛЯ НАС ЖА ЯНА — РОДНАЯ СТЫХІЯ!

Ваша дзейнасць на біржах:
РАСІЙСКАЙ ТАВАРНА-СЫРАВІННАЙ,
МАСКОЎСКАЙ ТАВАРНАЙ,
БЕЛАРУСКАЙ УНІВЕРСАЛЬНАЙ,
МІНСКАЙ ТАВАРНАЙ
будзе паспяховай з дапамогай брокерскай фірмы «АПЦЫЁН».

Звяртайцеся на адрас: 220600, г. Мінск, пл. Свабоды, 7б (3-і паверх).
Тэлефон: 26-67-50.
Факс: (0172) 20-56-96.
Тэлекс (64) 25-22-93 IDEA SU.

ИДЕЯ IDEA

ТОЛЬКІ Ў НАС!

Гадавая гарантыя, фірменнае абслугоўванне.

НАБЫВАЙЦЕ лазерныя прынтэры сусветна вядомых фірм HEWETT і PACKARD і MANN ESMANN TALLU.

Адгрузка — са склада.

Наш адрас: 220004, г. Мінск, вул. Сухая, 7, А/Т «Ідэя».

Тэлефоны: 20-56-96, 20-13-22.

Факс: (0172) 20-56-96.

Тэлекс: 25-22-93 IDEA.

Рэкламная фірма «БЕЛОР».

Галоўны рэдактар У. Б. НАРКЕВІЧ.

НАШ АДРАС
220041, гор. Мінск, Ленінскі праспект, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52; 32-41-92, рэкламы і аб'яў — 32-35-91, навін — 32-60-13.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні неабавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Тыраж 102.822.
Індэкс 63850.
Зак. № 111.

Выходзіць 250 разоў на год.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12